Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

26 МАЯ 2007 г. СУБОТА

№ 96 (25961)

Кошт 350 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

З сярэдзіны наступнага тыдня гарачыня пойдзе на спад

У бліжэйшыя трое сутак захаваецца гарачае надвор'е, паведаміла галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга Фядотава. Пры гэтым месцамі, у асноўным па паўночна-заходняй палавіне рэспублікі не выключаны навальнічныя кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ў начны час складзе ад 12 да 20 градусаў цяпла, удзень будзе ад 27 да 34 градусаў вышэй за нуль.

У аўторак, 29 мая, дажджы ахопяць значную частку тэрыторыі краіны. Аднак будзе па-ранейшаму горача — да 30 градусаў.

Толькі ў сераду атмасферныя франты, што перамяшчаюцца з Заходняй Еўропы, прынясуць паніжэнне тэмпературы да 18—24 градусаў цяпла. Пры гэтым у многіх раёнах пройдуць дажджы, месцамі моцныя. Магчыма і шквалістае ўзмацненне ветру.

Таццяна ЛОБАС, БЕЛТА.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«МЫ ПРАДАСТАВІМ НАЛЕЖНУЮ ПАДТРЫМКУ ЛЬГОТАМІ ТЫМ, ХТО Ў ІХ САПРАЎДЫ МАЕ ПАТРЭБУ»

Учора завяршылася двухдзённая рабочая паездка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі па Брэсцкай вобласці. Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з вынікамі сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна, наведаў шэраг новых і рэканструяваных спартыўных аб'ектаў у Брэсце, а таксама ўзяў удзел у цырымоніі ўрачыстага адкрыцця Брэсцкага абласнога цэнтра алімпійскага рэзерву па вяслярных відах спорту.

Азнаямленне з вынікамі пасяўной, навядзеннем парадку на зямлі ў Мінскай і Брэсцкай абласцях Аляксандр Лукашэнка пачаў яшчэ з борта верталёта. Як пазней адзначыў Прэзідэнт, убачанае яго здаволіла: культура земляробства, асабліва на Міншчыне, у адпаведнасці з яго патрабаваннямі ўзнята на даволі высокі ўзровень. Заключным пунктам першага дня паездкі кіраўніка дзяржавы стала малочнатаварная ферма СВК «Чарнаўчыцы». Трэба адзначыць, што Брэстчына для візіту была абрана невыпадкова. Тут ужо 30 працэнтаў кароў утрымліваюцца і дояцца па новых тэхналогіях. Да канца года іх стане 47 працэнтаў. Як вынік, малако на Брэстчыне — прыбытковае і без дзяржаўных датацый.

Расказваючы пра ферму ў «Чарнаўчыцах», губернатар Брэстчыны Канстанцін Сумар адзначыў, што гэта звышсучаснае, энергазберагальнае прадпрыемства еўрапейскага ўзроўню было пабудавана «з нуля» ў самыя сціслыя тэрміны — за 16 месяцаў. Менавіта такую задачу па мадэрнізацыі малочнай галіны некалькі гадоў таму паставіў кіраўнік дзяржавы. У «Чарнаўчыцах» абралі нестандартны падыход для выканання гэтага даручэння. За аснову фермы новага ўзору былі ўзяты лепшыя замежныя тэхналогіі, адаптаваныя да нашых умоў. Кароўнікі, замест звыклых, бетонных або цагляных сцен, атрымалі аўтаматычную ралетную сістэму, якой кіруюць кампʼютары. Так, калі надвор'е даволі цёплае, як гэта было ў чацвер, сцен у звыклым для нас разуменні ў фермы зусім не было. Як патлумачыў Канстанцін Сумар, раней памылкова лічылася, што каровам круглы год неабходна «плюсавая» тэмпература. Аднак, як паказвае вопыт той жа Канады, дзе каровы пры тэмпературы -40 °С на вуліцы маюць -6° , -8° у памяшканні і даюць рэкордныя надоі, гэта не так. Жывёле ў першую чаргу патрэбны добры корм і свежае паветра ў поўным аб'ёме. Якраз апошняга ў жалезабетонных будынках і не стае. У новых умовах чарнаўчыцкія рагулі, якіх без дадатковага адбору перасялілі з фермы, што патрабавала рэканструкцыі, летась ужо далі больш за 6 тыс. кг малака. Цяпер пастаўленая планка ў 8,5 тыс. кг зусім не падаецца недасягальнай. Да таго ж з-за створаных санітарна-экалагічных умоў атрыманая прадукцыя новай фермы практычна не ўтрымлівае амяку. З усім пагалоўем (а гэта да тысячы кароў у сезон) спраўляюцца ўсяго дзве даяркі, якія працуюць на імпартных дайльных установоўках. Цікавая і яшчэ адна лічба — кубічны метр новай фермы каштуе больш як на 30 працэнтаў танней за такі ж аб'ём фермы традыцыйнай. І ўсё ж такі праблема з ноў-хау існавала: новыя тэхналогіі, нягледзячы на ўсе свае «плюсы», не адпавядалі існуючым нарматыўным дакументам. Менавіта з наведваннем фермы кіраўніком дзяржавы губернатар звязваў вялікія надзеі. Бо будавалася гэта пакуль адзінае ў Беларусі прадпрыемства, каб у тым ліку і прадэманстраваць праекціроўшчыкам, будаўнікам ды і вучоным магчымасці сучасных тэхналогій, што дазваляюць вывесці вытворчасць малака на новы ўзровень.

Скрупулёзна азнаёміўшыся з умовамі ўтрымання рагатай жывёлы, новымі тэхналогіямі, выкарыстанымі на ферме, А. Лукашэнка прызнаў такі варыянт малочнатаварнай фермы «нядрэнным». Паводле слоў Прэзідэнта, каровы знаходзяцца ў сапраўдным «палацы». Вось толькі палацы пакуль дарагія — ферма ў Чарнаўчыцах абышлася амаль у 5 мільёнаў долараў. Прэзідэнт паставіў задачу зрабіць будаўніцтва таннейшым як мінімум на 25 працэнтаў.

«Мы навучыліся будаваць такія фермы, і гэта вучоба нам абышлася дорага, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Надалей так будаваць не павінны. Кошт, кошт і яшчэ раз кошт — гэта патрабаванне адносіцца і да аграгарадкоў, мехдвароў, сельскагаспадарчых прадпрыемстваў».

Яшчэ адна буйная задача, якую паставіў кіраўнік дзяржавы перад сельскагаспадарчай галіной — стварыць стратэгію ўзнаўлення дойнага статка краіны высокапрадукцыйнымі цялушкамі. Прычым жывёла не павінна купляцца за валюту за мяжой.

«Павінна быць беларуская чорна-пярэстая карова», — заявіў Прэзідэнт. Для гэтага навука павінна працаваць у звязцы з вытворчасцю. Работу трэба пачынаць ужо сёння, бо на стварэнне новых высокапрадукцыйных парод пойдзе не адзін год.

Учора кіраўнік дзяржавы азнаёміўся на базе спартыўных аб'ектаў Брэста са станам і перспектывамі развіцця фізічнай культуры і спорту Брэсцкай вобласці. Як паведамілі Аляксандру Лукашэнку, абласная фізкультурна-спартыўная арганізацыя займаецца развіццём 50 відаў спорту, 31 з якіх з'яўляецца алімпійскім. Падрыхтоўка спартыўнага рэзерву ажыццяўляецца ў 66 навучальна-спартыўных установах і абласным вучылішчы алімпійскага рэзерву, дзе займаецца больш за 30 тыс. чалавек. Толькі ў самім Брэсце ёсць 542 спартыўныя аб'екты. Дзякуючы падтрымцы і дапамозе Прэзідэнта, у горадзе завершана будаўніцтва «Лядовага палаца», лёгкаатлетычнага манежа, стралковага ціра, першага ў рэспубліцы бейсбольнага стадыёна, вяслярнага канала. Адкрыты цэнтр алімпійскага рэзерву па гульнявых відах спорту «Вікторыя». Яго будаўніцтва было распачата ў 2003 годзе, у 2004-м, калі здавалася першая чарга аб'екта, цэнтр наведаў А. Лукашэнка, які даручыў зрабіць комплекс больш універсальным. І вось учора Прэзідэнт змог ацаніць ужо гатовы дзеючы спартыўны аб'ект сусветнага ўзроўню. Канструкцыя і абсталяванне спарткомплексу дазваляюць праводзіць у ім міжнародныя спаборніцтвы, чэмпіянаты і першынствы Рэспублікі Беларусь па гульнявых відах спорту.

Прэзідэнт паставіў задачу заваяваць хоць бы па аднаму алімпійскаму медалю ў кожным відзе спорту і заклікаў да дасягнення больш высокіх вынікаў у беларускім гандболе. Прэзідэнт падкрэсліў, што на сёння галоўнае ў гэтай сферы — падрыхтоўка трэнераў. «Трэнерам павінны быць створаны ўсе ўмовы, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Мы павінны дабівацца поспеху, па крайняй меры, на такім жа ўзроўні, як расійскія гандбалісты».

Сапраўдным святам вясны і спорту стала ўрачыстае адкрыццё вяслярнага канала ў Брэсце, якое сабрала тысячы брастаўчан. Сярод гасцей прысутнічалі знакамітыя айчынныя і замежныя спартсмены, алімпійскія прызёры і чэмпіёны: Сяргей Бубка, Кацярына Карстэн, Юлія Несцярэнка, Юлія Бічык і многія іншыя, а таксама генеральны сакратар Міжнароднай федэрацыі веславання спадар Сміт. І гэта не дзіўна — спартыўныя аб'екты такога ўзроўню, акрамя Беларусі, маюць усяго дзве краіны свету. Таму Брэст у бліжэйшы час цалкам апраўдана можа разлічваць на правядзенне міжнародных спаборніцтваў самага высокага ўзроўню. Гэта пацвердзілі і міжнародныя спецыялісты. Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка падчас урачыстай цырымоніі: «Літаральна за паўтара года зарослая хмызняком набярэжная Мухаўца ператварылася ў спартыўны аб'ект сусветнага ўзроўню. Цяпер нацыянальным зборным для падрыхтоўкі да Алімпіяды і этапаў Кубка свету створаны ўсе ўмовы. Да таго ж, згодна з патрабаваннем Прэзідэнта, Брэст атрымаў не толькі прэстыжны спартыўны комплекс, але і выдатнае месца для адпачынку і аздараўлення мясцовых жыхароў». Як адзначыў кіраўнік дзяржавы: «Поспехі ў спорце — гэта не толькі прэстыж краіны, але і вырашэнне праблем абараназдольнасці, дэмаграфічнай бяспекі, умацавання генафонду нацыі. Нам вельмі патрэбны людзі, дзеці, але здаровыя». Многа цёплых слоў Аляксандр Лукашэнка адрасаваў брэсцкім праекціроўшчыкам і будаўнікам, якія ўзвялі аб'ект у самыя сціслыя тэрміны. Сімвалічны ключ, уручаны імі Прэзідэнту, беларускі лідар з самымі цёплымі пажаданнямі перадаў бронзавай прызёрцы па акадэмічнаму веславанню Алімпійскіх гульняў у Атланце Юліі Бічык, якая будзе прадстаўляць нашу краіну ў Пекіне. Дарэчы, падчас наведвання Цэнтра алімпійскага рэзерву па гульнявых відах спорту Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з узорамі формы, якая распрацоўваецца для нашай алімпійскай зборнай.

У завяршэнне рабочай паездкі па Брэстчыне Аляксандр Лукашэнка адказаў на пытанні журналістаў. Прэзідэнт высока ацаніў наведаныя спартыўныя комплексы. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, ён нікольні не шкадуе выдаткаваных на іх грошай: «Узведзены спартыўныя аб'екты сапраўды сусветнага ўзроўню для падрыхтоўкі спартсменаў сусветнага ўзроўню», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Не ўхіліўся кіраўнік дзяржавы і ад пытання, якое сёння хвалюе многіх у Беларусі — аб упарадкаванні льгот. Як заявіў беларускі лідар: «Адмена некаторых ільгот — гэта не прыхамаць Прэзідэнта, а аб'ектыўная рэальнасць. Не можа ў краіне з 10-мільённым насельніцтвам быць 7,5 мільёна ільготнікаў». Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што такая непапулярная мера не панізіць аўтарытэт Прэзідэнта і ўладаў. Людзі старэйшага пакалення, якія заўсёды былі яго апорай, не здрадзяць і пасля скасавання некаторых ільгот. Прэзідэнт патлумачыў, што ён пайшоў ім насустрач, калі па шматлікіх просьбах не стаў паднімаць узрост выхаду на пенсію. Аднак праводзіць людзей на заслужаны адпачынак амаль у сярэдзіне жыцця, ды яшчэ забяспечыць усемагчымымі льготамі, дзяржава сабе дазволіць не можа. Калі па-папулісцку вырашыць і гэта пытанне, «праз пару гадоў краіна будзе знішчана». У той жа час дзяржава не кіне людзей сам-насам з іх праблемамі. Як заявіў Аляксандр Лукашэнка, зараз вядзецца падрыхтоўка ўказа Прэзідэнта аб сістэматызацыі льгот. «Мы прадаставім належную падтрымку льготамі тым, хто ў іх сапраўды мае патрэбу», — падкрэсліў Прэзідэнт. У той жа час грошы, якія выслабаняцца ў выніку скасавання льгот, пойдуць навят не на спартыўныя аб'екты, а на падтрымку сем'яў і дзяцей.

Пасля паспяховых перамоў з Іранам сярод асобных расійскіх палітыкаў мусіруецца меркаванне, што Беларусь аддаляецца ад Расіі. Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, гэту сітуацыю ўвогуле можна пракаментаваць вельмі проста: «Калі б Расія не хацела, каб Беларусь ад яе аддалялася, гэтага б не здарылася». Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што Расійская Федэрацыя двойчы «перакрывала дыханне» нашай краіне, калі бралася за вентыль. Натуральна, Прэзідэнт быў вымушаны рэагаваць. Каб зменшыць залежнасць ад Расіі, ЕС, Беларусь павінна шукаць новыя рынкі, той жа Іран закупляе тавараў на 60 млрд долараў у год. Гэта можа быць і наша прадукцыя. І калі нас туды запрашаюць здабываць нафту, чаму мы павінны адмаўляцца? Натуральна, у такім выпадку нашай краінай не ўдасца маніпуляваць з дапамогай таго ж вентыля.

«Беларусь — незалежная суверэнная дзяржава, і гэта трэба прымаць як дадзенае, — заявіў Прэзідэнт. — Апошнім часам гэта разуменне прыходзіць і да нашых партнёраў...».

Сяргей ПРОТАС.

Брэсцкая вобласць.

«НА ДУХА БУДЗЕ ЦЁПЛА І СУХА»

Абрад «Пахаванне стралы» у вёсцы Казацкія Балсуны Веткаўскага раёна.

Так сцвярджае народная прымаўка. І да яе варта прыслухацца, таму што стагоддзі назіранняў за прыродай навучылі нашых продкаў рабіць прагнозы без аніякай дадатковай тэхнікі. Ды зразумела і так: вясна канчаецца, летам пахне. Час Сёмуху святкаваць. Ды святую Тройцу вітаць.

У народзе гэтыя святы спалучыліся: як прырода знаходзіцца ў росквіце, усё навокал зялёнае, напоўнілася сілай, так і царква Хрыстова ў гэтыя дні адчувае сваю моц, услаўляючы Святую Тройцу — Бога-бацьку, сына ягонага, які ўваскрос, і Святога Духа. Ды як у хатах было заведзена на Сёмуху ўпрыгожваць зялёнымі раслінамі хаты, дык і ў храм Божы з імі ішлі, нібыта з падарункамі. Можа, таму, што свята Тройцы лічыцца нараджэннем Царквы — у гэты дзень Дух Святы сышоў на апосталаў і панеслі яны словы аб цудоўным ўваскрашэнні па ўсім свеце. Дзень гэты ўшаноўваецца і ўваходзіць у лік дванаццаці галоўных хрысціянскіх святаў...

Яшчэ ў ранейшыя часы з'явіўся звычай адзначаць наступны тыдзень пасля Сёмухі, ладзіць своеасаблівыя дні провадаў вясны. У ход ішло ўсё, што дала вясна: зялёныя галінкі дрэў маглі нават стаць дадатковай вопраткай для людзей, вянкі з кветак упрыгожвалі галовы дзяўчат. Што ўжо казаць пра жыллё, якое некалі ведала руку самага лепшага дызайнера ў свеце — самой матухны-прыроды. На Сёмуху людзі неслі ў хату тое, што яна дала на гэты час. Маем упрыгожваліся сцены, а дзе і галінкамі клёну, ліпы, замест дываноў на падлозе вяскоўцы хадзілі па рагазе і ведалі — у хаце не будзе блох, а, мо, і іншай нечысці. Можа, таму светлы настрой і свежы водар панавалі ў хатах. Каго падзякаваць за святочны настрой? Прыроду, натуральна, за багацце, якое яна падарыла роднай зямлі. Але і продкаў, якія раскрылі яе сакрэт, навучыўшыся тут жыць. Вось і казалі ім дзякуй: напярэдадні Сёмухі якраз «зялёная субота», летнія дзяды па-беларуску, ці дзень памінання. Каб і дзякуй сказаць за свой дабрабыт, і памаліцца за іх душы. Вось і сваёй лягчэй, радасней стане. Па-вясноваму. Ці па-летняму ўжо?..

Ларыса ЦІМОШЫК.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

28 мая 2007 года ў 16.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) прадоўжыць работу сёмая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Парламенцкі дзённік

Урад адказаў на пытанні парламентарыяў

Учора адбылася сумесная сесія Савета Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, падчас якой парламентарыі заслухалі адказы прадстаўнікоў ураду. З асноўным выступленнем на сесіі выступіў першы намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Сямашка. Галоўная задача ўрада, паведаміў ён, — захаванне высокіх тэмпаў росту эканомікі, выкананне гадавых прагнозных паказчыкаў, мінімізацыя наступстваў для насельніцтва росту цэн на газ і нафту.

СТВАРАЕЦЦА БЕЛАРУСКАЯ НАФТАВАЯ КАМПАНІЯ

Як адзначыў У. Сямашка, у нашай краіне ствараецца нафтавая кампанія, якая будзе займацца аптовым закупам і аптовым продажам нафты. Кампанія ўжо зарэгістраваная.

Закупляцца нафта будзе ў першую чаргу ў Расіі. Паводле слоў У. Сямашкі, адносіны з гэтай краінай у нас заўсёды будуць прыярытэтнымі. І закупляем нафту мы ў ёй усё ж такі па льготных цэнах, нават нягледзячы на ўвядзенне ўвазных мытных пошлін. Калі цана нафты на сусветных рынках набліжаецца да 500 долараў за тону, то мы яе закупляем у Расіі недзе каля 370 долараў.

Дарэчы, у Беларусі ўжо маецца вопыт дзеяння падобных кампаній, у прыватнасці, Беларускай калійнай кампаніі. І вопыт гэты пасяховы: рэнтабельнасць прадпрыемства — больш 60 працэнтаў, а выручка, якая плануецца на гэты год ад продажу на экспарт 7,1 млн тон калію, павінна скласці 1,15 млрд долараў.

Плануецца, што працаваць беларуская нафтавая кампанія пачне з пачатку ліпеня гэтага года.

ЗА ГАЗ РАСПЛАЦІМСЯ ДА 23 ЛІПЕНЯ

Пакуль мы плацім за газ не цалкам — на ўзроўні 55 працэнтаў. А таму з пачатку года, калі Расія падняла цану на газ, стварылася запазычанасць. Цяпер Беларусі да 23 ліпеня гэтага года неабходна яе пагасіць. Як адзначыў У. Сямашка, выйсце з гэтай сітуацыі будзе знойдзена.

БЕЛАРУСЬ АТРЫМАЕ КРЭДЫТНЫ РЭЙТЫНГ

Плануецца, адзначыў У. Сямашка, што гэта адбудзецца ўжо ў чэрвені гэтага года. Зразумела, пакуль чакаць высокага крэдытнага рэйтынгу наўрад ці трэба. Аднак з цягам часу ён будзе расці. Тым не менш і на гэтым этапе рэйтынг дазволіць прыцягваць замежныя крэдыты на больш выгадных умовах.

РЫХТУЕЦЦА АМНІСТЫЯ

Міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў адзначыў, што да канца гэтай сесіі ў парламент можа паступіць законапраект, які прадугледжвае правядзенне амністыі. Паводле яго слоў, гэта магло б адбыцца і раней, аднак «не ўсе пагадзіліся з катэгорыямі грамадзян, якія падпадуць пад амністыю». У выніку пытанне прыйшлося ўрэгуляваць з усімі зацікаўленымі бакамі на працягу трох месяцаў. Цяпер законапраект знаходзіцца ў Адміністрацыі Прэзідэнта. Там кажуць, што на працягу двух-трох тыдняў ён будзе ўзгоднены і накіраваны ў парламент.

ПІВА СТАНЕ ПІЦЬ НЯМОДНЫМ?

У. Навумаў адзначыў, што Міністэрства ўнутраных спраў ніколі не выступала за абмежаванне продажу піва. Выступала за іншае — абмежаванне распіцця піва ў грамадскіх месцах. Так, прапанавалася прызнаць піва слабаалкагольным спіртным напоем, а за распіццё такіх напояў у грамадскіх месцах наступае адміністрацыйная адказнасць. Аднак, адзначыў У. Навумаў, «пакуль наша ініцыятыва нікім не падтрымана».

Міністр унутраных спраў лічыць, што «неабходна засяродзіць свае намаганні на альтэрнатыўных занятках — катанні на веласіпедзе, ролікавых каньках — і гэта некалькі адцягне ўвагу моладзі». Пры гэтым ён выказаў упэўненасць, што ў бліжэйшыя год-два стане для большасці моладзі нямодным піць піва.

ЖЫЛЛЁ СТАНЕ ТАННЕЙШЫМ?

Хутка можа быць уведзена абмежаванне росту цэн пры будаўніцтве жылля. Як паведаміў міністр будаўніцтва і архітэктуры Аляксандр Селязнёў, ужо распрацаваны праект прэзідэнцкага ўказа, які прадугледжвае падобныя дзеянні. У адпаведнасці з указам, грамадзяне, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і стаяць на чарзе, будуць будаваць жыллё па сабекошту плюс 15—20 працэнтаў.

Паводле яго слоў, сёння цана 1 кв. метра жылля, які будуецца з дапамогай дзяржавы, не перавышае 450 долараў у панельных дамах і 500 — у цагельных. Аднак такога жылля яўна недастаткова, што выклікае неабгрунтаваны рост цэн на другасным рынку і на будаўніцтва камерцыйнага жылля. Сёння 1 кв. метр камерцыйнага жылля дасягае сумы ў 1,5—2 тыс. долараў.

Міністр плануе, што ўказ будзе прыняты на працягу 1,5 месяца.

Сяргей КАРАЛЕВІЧ.

Радок «Звязды» ў гісторыі краіны

Рэдактар падпольнай «Звязды» Уладзімір Амельянюк загінуў — але газета ўсё роўна выйшла

65 гадоў назад, 26 мая 1942 года, загінуў Уладзімір Амельянюк, рэдактар першага нумара падпольнай газеты «Звязда», адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Мінскага патрыятычнага падполля, Герой Савецкага Саюза.

Уладзімір Сцяпанавіч Амельянюк нарадзіўся ў 1917 годзе. Скончыў педагагічныя курсы, працаваў піянерважатым, настаўнікам, рэдактарам Дзяржынскай раённай газеты. Перад Вялікай Айчыннай вайной быў студэнтам Камуністычнага інстытута журналістыкі ў Мінску.

Вайна застала маладога журналіста ў Беластоку, дзе ён праходзіў вытворчую практыку... Шмат дзён і начэй прабіраўся ён да Мінска, дзе жылі бацькі, жонка Ліда і сын Гена. Ад варожай бомбы загінула сястра Зіна з дзецьмі. Хацелася помсціць, знішчаць акупантаў. Вызваляць Радзіму. Але — як?..

(Заканчэнне на 2-й стар.)

27 МАЯ — ПРАФЕСІЙНАЕ СВЯТА ХІМІКАЎ

Дырэктар Магілёўскага завода штучнага валакна Алег БУРАКОЎ:

— Гавораць, што ў хімікаў асаблівы менталітэт. Гэта праўда. Па-першае, хімічная галіна небяспечная і працаваць тут няпроста. Па-другое, хімічны працэс ідзе ў адпаведнасці з часам, і калі ты разгубіўся і страціў час, то гэта — брак, урон прадпрыемству і людзям. Таму меней слоў — больш справы! Такая і пазіцыя ўсяго канцэрна «Белнафтахім»: прыйшлі, вырашылі, зрабілі.

(Працяг тэмы чытайце на 4-й стар.)

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ

здания РБУ (общ. пл. 824,4 кв.м), расположенного по адресу : г. Логойск, ул. Заводская, 36. Начальная цена составляет – 367 300 000 бел. руб. Полное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 21.09.2006г. Аукцион состоится 12.06.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 11.06.2007г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322.

Контактные телефоны (8017) 2246134, (801774) 55467. Сайт в Интернете: www.rlt.by.

ОАО «МИНСКИЙ ЗАВОД «КАЛИБР» (ПРОДАВЕЦ) СОВМЕСТНО С КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

проводят открытый аукцион по продаже незавершенной строительством летней базы отдыха «Левки», расположенной в районе озера «Левки» Стародорожского района Минской области, на земельном участке об. пл. 1,1005 га. Начальная цена — 191 888 462 бел. руб. с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 19.04.2007 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 08 июня 2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 07 июня 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 322.

Телефон (8017) 224-61-34. Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

ОАО «КУПАЛИНКА» Г. СОЛИГОРСК (ПРОДАВЕЦ) СОВМЕСТНО С КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ:

Лот № 1: изолированное помещение, об. пл. — 2586,1 кв.м, начальная цена — 963 185 405 белорусских рублей с НДС; Лот № 2: изолированное помещение, об. пл. — 1291,5 кв.м, начальная цена — 463 685 096 белорусских рублей с НДС, расположенных по адресу: Солигорский район, Метявичское шоссе, 5. Задаток в размере 5% от начальной цены лота и перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «Белпромстройбанк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 6 июня 2007 г. в 14.00 по адресу: г. Солигорск, ул. Заслонова, 58, к. 510 (зал заседаний). Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 5 июня 2007 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322.

Телефон (8017) 224-61-34. Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

$40 000 І 40 000 ЕЎРА — СА СКЛЕПА

Не пашанцавала сталічнай сям'і, у дом да якіх у вёсцы Краснае, што ў Маладзечанскім раёне, завітаў няпрошаны госць.У чужое жыллё невядомы пранік, падабраўшы ключ да дзвярэй. Здабычу ж ён знайшоў у склепе пад домам: удачлівы крымінальнік забраў адтуль прыхаваныя 40 тысяч долараў і 40 тысяч еўра.

Ігар ГРЫШЫН.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

УКРАІНА: ЗНОЎ СУТЫКНЕННІ

У пятніцу прэзідэнт Украіны Віктар Юшчанка падпарадкаваў сабе ўнутраныя войскі МУС, вывеўшы іх з падпарадкавання міністэрства. Пры гэтым ён даручыў камандуючаму УВ Аляксандру Кіхценку забяспечваць парадак каля важнейшых дзяржаўных аб'ектаў, у прыватнасці, будынкаў Канстытуцыйнага суда і Генпракуратуры Украіны.

Напярэдадні кіраўнік МУС Васіль Цушко ўмяшаўся ў канфлікт вакол звальнення генпракурора Украіны Святаслава Піскуна. Юшчанка палічыў гэтыя дзеянні міністра злачынствам, і ўчора супраць Цушко была ўзбуджана крымінальная справа. МУС краіны заявіла, што нягледзячы на ўказ прэзідэнта, яно будзе дзейнічаць па закону, які прадугледжвае падпарадкаванне ўнутраных войск міністэрству.

ГАРЭЛА АСТАНКІНСКАЯ ТЭЛЕВЕЖА

Учора на Астанкінскай тэлевежы адбылося ўзгаранне.

Пажар на плошчы ў 2 квадратныя метры адбыўся на вышыні 340 метраў — з-за зварачных работ загарэўся ўцяпляльнік. Пасля паступлення сігналу аб узгаранні былі адключаны ліфты і пачалася эвакуацыя людзей. Пажар быў ліквідаваны ў 12.52 па маскоўскім часе, пацярпелых няма.

ISSN 1990-763X

Падпіска-2007

СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВАЕ ПАЎГОДДЗЕ

Пачалася падпіска на 3-і квартал і II паўгоддзе 2007 года.

ПАДПІСНЫЯ ЦЭНЫ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА» (У РУБЛЯХ, УСТАНОЎЛЕНЫ З 01.07.2007 Г.)

Індэкс	*на 1 месяц*	*на 3 месяцы*	*на 6 месяцаў*
63850 (індывідуальны)	**8200**	**24600**	**49200**
63145 (індывідуальны льготны, для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	**7850**	**23550**	**47100**
63858 (ведамасны)	**13000**	**39000**	**78000**
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	**11850**	**35550**	**71100**

СПАДЗЯЁМСЯ НА ВАШУ ПАДТРЫМКУ, паважаныя падпісчыкі і работнікі паштовай сувязі.

ПАЖАР ПАСЛЯ РАМОНТУ

Паводле інфармацыі начальніка цэнтра прапаганды і абучэння Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС Ігара Сандуленкі, паведамленне аб пажары ў адным з цэхаў вытворчасці капралактаму прадпрыемства «Гродна Азота» паступіла ад рабочага ў 23 гадзіны 41 хвіліну. І ўжо праз дзве хвіліны выратавальнікі прыступілі да ліквідацыі ўзгарання на плошчы 25 квадратных метраў.

Пажар быў лакалізаваны на працягу чатырнаццаці хвілін, а поўная яго ліквідацыя заняла паўгадзіны. Пацярпелых няма. Усе звязаныя з узнікненнем пажару абставіны ўстанаўліваюцца. Вядома, што гэта здарылася падчас пуску абсталявання.

Барыс ПРАКОПЧЫК

...Газета ўсё роўна выйшла

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ужо са жніўня 1941-га Амельянюк — у складзе Камароўскай падпольнай групы. Распаўсюджваў зводкі Саўінфармбюро, пісаў лістоўкі. Удзельнічаў у вызваленні ваеннапалонных з лагераў смерці, у стварэнні падпольнай друкарні, падтрымліваў сувязь з Дзяржынскім падполлем і партызанскімі атрадамі Мінскай вобласці.

Дзёрзкія аперацыі мінскіх падпольшчыкаў не пакідалі ў спакоі акупантаў. Аблавы, вобыскі, налёты, частыя змены пашпартнага рэжыму... Падполле зведала некалькі буйных удараў — у кастрычніку 41-га і ў сакавіку 42-га фашысты ўчынілі зверскую расправу над патрыётамі. Але Мінск не здаўся. Гісторыя сведчыць: для гітлераўцаў выхад падпольнай газеты «Звязда» быў падобны да выбуху магутнай бомбы... Якую мужнасць трэба было мець, каб у стане ворага заклікаць да знішчэння ворага, каб выкрываць гебельсаўскую хлусню, што лілася з прафашысцкіх друкаваных выданняў...

«З сённяшняга дня Мінскі Гаркам КП(б)Б аднаўляе выданне свайго органа — газеты «Звязда». Пішыце ў газету аб жыцці партызанскіх атрадаў, аб баявой іх дзейнасці, аб паасобных партызанах, праявіўшых сябе ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі акупантамі.

Рэдкалегія».

Газета-патрыётка яднала народ у імя Перамогі, заклікаючы:

«Паднімайцеся ўсе, каму дарога наша Радзіма, на ўсенародную барацьбу супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў!».

І народ змагаўся. Нягледзячы на зверствы, якія творылі нямецка-фашысцкія акупанты, яны ні дня не адчувалі сябе гаспадарамі на беларускай зямлі. Духоўна моцны народ нельга скарыць, паставіць на калені. Першы нумар «Звязды» быў тайна набраны ў нямецкай друкарні, надрукаваны на канспіратыўнай кватэры М.П. Воранава. Другі і трэці нумары выйшлі ў падпольнай друкарні ў доме Т. Якавенкі. Чацвёрты нумар надрукаваны на канспіратыўнай кватэры П. Хадасевіча. Пяты нумар быў падрыхтаваны да друку, але не выйшаў з-за масавых арыштаў падпольшчыкаў Мінска. У выданні і распаўсюджванні падпольнай «Звязды» ўдзельнічалі У. Нікіфараў, Я. Савіцкая, У. Казачонак, А. Карпусенка, М. Рынкевіч, Б. Пупко, М. Свірыдаў, С. Благаразумаў, сям'я Ц. Трафамюка, А. Грышын, Х. Александровіч і многія-многія іншыя патрыёты.

...Уладзімір Амельянюк загінуў ад варожай кулі пры выкананні задання, непадалёк ад Чырвонага касцёла. Прыкладна на тым месцы, дзе пасля вайны на галоўнай плошчы беларускай сталіцы — плошчы Незалежнасці — установлены помнік журналістам-падпольшчыкам...

Таццяна ПАДАЛЯК.

Фота Анатоля Клешчука.

Помнік журналістам-падпольшчыкам на плошчы Незалежнасці г. Мінска.

Прамая лінія

СЯМ'Я, ДЗЕЦІ, ДАПАМОГА

На пытанні «прамой лініі» адказвае намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна Васільеўна ШЭМЕТАВЕЦ.

(Працяг. Пачатак у нумарах за 23, 24, 25 мая)

☎ — Хацелася б даведацца: якія льготы ёсць у шматдзетных сем'яў?

Наталля Яўгенаўна ДРАБЫШЭВІЧ,

Слуцкі раён

— Ільгот у шматдзетных сем'яў шмат, таму спынімся на асноўных. Да прыкладу, такія сем'і маюць права на 50-працэнтнае зніжэнне аплаты за карыстанне дзіцячымі дашкольнымі ўстановамі, льготы па харчаванню, надбаўкі да дапамог па беспрацоўю, асобам, што маюць траіх і больш дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў (або навучэнцам — ва ўзросце да 18 гадоў), дапамога па часовай непрацаздольнасці аплачваецца ў 100 працэнтаў ад заробку ўжо з першага дня хваробы.

Шматдзетныя сем'і вызваляюцца ад падатку на зямлю. Ёсць у дадзеным выпадку і льготы па падаходнаму падатку — зараз ім не абкладаюцца заробкі кожнага з бацькоў у памеры 4 базавых велічынь на кожнае дзіця ва ўзросце да 18 гадоў. У прыватнасці, калі ў сям'і трое дзяцей, падаходным падаткам у мужа і ў жонкі не абкладаецца зарплата ў памеры 12 базавых велічынь. А базавая велічыня зараз — гэта 31 тыс. рублёў.

Асобная тэма — пенсійныя гарантыі. Жанчыны, якія нарадзілі 5 і больш дзяцей, выхавалі іх да 8-гадовага ўзросту (або калі пятаму дзіцяці яшчэ не споўнілася 5 гадоў) і маюць 15-гадовы працоўны стаж, могуць выходзіць на пенсію раней — у 50 гадоў. А жанчыны, якія нарадзілі і выхавалі да 16-гадовага ўзросту 5 і больш дзяцей, маюць не менш чым 10-гадовы стаж у сельгасвытворчасці (без уліку часу догляду дзяцей), могуць выходзіць на пенсію незалежна ад узросту.

Маці, якая выхоўвае траіх і больш дзяцей, прадастаўляецца адзін свабодны ад работы дзень у тыдзень з аплатай у памеры сярэднядзённага заробку.

Далей. Шматдзетная сям'я мае права на першачарговае ўключэнне ў чаргу на паляпшэнне жыллёвых умоў. Такім сем'ям могуць прадастаўляцца льготныя крэдыты ў памеры 95 працэнтаў ад кошту будаўніцтва жылля на 40 гадоў — з разліку 20 квадратных метраў на чалавека. Нарэшце, існуе механізм дапамогі ў пагашэнні падобных крэдытаў. Пры нараджэнні 3-га дзіцяці сума запазычанасці па льготнаму крэдыту змяншаецца на 30 працэнтаў, чацвёртага дзіцяці — на 50 працэнтаў, а пятага дзіцяці — на ўсе 100 працэнтаў.

Да таго ж, паколькі значная частка шматдзетных сем'яў мае невялікі ўзровень даходу на кожнага чалавека, варта зноў-такі ўзгадаць аб такіх відах падтрымкі, як бясплатнае харчаванне на дзяцей ва ўзросце да 2 гадоў, адрасная сацыяльная дапамога, безнаяўныя жыллёвыя субсідыі.

☎ — Не адзін раз чула па тэлебачанню, што ў Мінску плануецца стварыць дзяржаўную службу сядзелак з нашмат меншымі, чым у «прыватнікаў» расцэнкамі. У сувязі з гэтым хацелася б ведаць, ці не плануецца таксама стварыць дзяржаўную службу нянек? Бо ў дзіцячыя садкі нашага раёна, на жаль, ёсць чарга...

Наталля ГОЛЬМАК,

г. Мінск

— Служба нянек фактычна існуе і сёння. Аднак бясплатна гэты від паслуг прадастаўляецца толькі сем'ям пры нараджэнні трайні. Ва ўсіх жа іншых выпадках падобныя паслугі могуць прадастаўляцца на ўмовах аплаты.

☎ — Ці можа муж аформіцца ў водпуск па догляду дзіцяці да 3 гадоў, пры гэтым адначасова стаць на ўлік у службе занятасці і атрымліваць дапамогу па беспрацоўю?

Антаніна Аляксандраўна,

Пастаўскі раён

— Аформіць на сябе догляд дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў муж, безумоўна, можа. А вось зарэгістравацца пры гэтым у якасці беспрацоўнага і атрымліваць дапамогу па беспрацоўю — не. Паколькі, паводле нашага заканадаўства, асобы, якія здзяйсняюць догляд дзіцяці, ужо лічацца занятымі.

☎ — Адразу некалькі пытанняў. Ці можа маці дзіцяць-інваліда, якому зараз 5 гадоў, зарэгістравацца ў якасці беспрацоўнай? Па-другое. Ці будзе выплачвацца пенсія на дзіця-інваліда ў выпадку, калі я пайду на работу на палову стаўкі? І нарэшце. Кажуць, што на дзіця-інваліда муж павінен плаціць аліменты ў памеры не 25, а 50 працэнтаў свайго заробку. Гэта так?

Аляксандра Сяргееўна,

Салігорскі раён

— Зарэгістравацца ў якасці беспрацоўнай, вы, Аляксандра Сяргееўна, можаце. Пры гэтым у выпадку працаўладкавання права на пенсію на дзіця-інваліда вы не страціце. Але ў такім разе знікнуць падставы для прызначэння дапамогі на догляд у памеры 65 працэнтаў ад бюджэту пражыткавага мінімуму — гэта дапамога прадастаўляецца толькі маці, бацьку або іншаму сваяку, якія не працуюць і не атрымліваюць пенсіі «на сябе».

Што да выплаты аліментаў на дзіця-інваліда ў павышаным памеры, то такой нормы ў заканадаўстве няма. Словам, тут дзейнічаюць агульныя правілы.

Сяргей ГРЫБ.

(Працяг будзе.)

Да юбілею «Звязды» засталося **75** дзён

Заўтра нас стане... Больш?

З нагоды юбілею любімай газеты думак у мяне шмат і, на жаль, не вельмі святочных. Апошнім часам злавіла сябе на тым, што, атрымаўшы свежы нумар, спачатку шукаю даўно знаёмыя і любімыя прозвішчы журналістаў, разглядаю фотаздымкі, чытаю загалоўкі, а потым — гляджу... тыраж. Сёлетняя розніца ў ім паміж першым і другім кварталам прыняла проста ў шок. Розніца паміж красавіком і маем, уразіла, здаецца, не менш.

Набрала ў галаву, дастала з хатняга «архіва» старыя нумары, якія там беражліва захоўваю. Вось лічбы з пачатку «новай эры»: 1991-ы год тыраж «Звязды» 211 тысяч, 1993-і — 177 тысяч, 1997 — 82...

Прыкінула, калі нічога не змяніць, то наступнага, стогадовага юбілею ў газеты... не будзе.

Спрабавала дадумацца тут, у далёкай ад сталіцы вёсцы, у чым прычына, чаму адзінае са штодзённых выданняў на першай дзяржаўнай мове апынулася ў гэтакім становішчы?

Вось што ў мяне атрымалася. Усё зусім не ў тым, што ў журналістаў «Звязды» не хапае прафесіяналізму; не ў тым, што «Звязда» неяк неаператыўна ці няякасна асвятляе падзеі і жыццё ў краіне. Прычына (як мне здаецца) менавіта ў мове. Любая з нацый вылучаецца сваёй. У нас жа яе, нейкай пэўнай, няма: у большасці людзей у паўсядзённым ужытку — дзве (можаце не згаджацца са мной) вартыя жалю пародыі.

І тут — зноў жа, маё меркаванне — нам трэба вызначыцца: калі мы «за» суверэнітэт, за тое, каб жыць, як людзі, асобна і самастойна, сваім розумам, сваёй сям'ёй, то трэба падымаць сваю, беларускую, калі ж мы, прабачце, сіроты казанскія, ні за душой, ні ў галовах нічога не маем і нажываць не бяромся, то...

Верыць у гэта не хочацца. А вось абдумваць і абмяркоўваць трэба. Чым не тэма для ток-шоў «Выбар»?

Што датычыцца мяне, то вучылася я ў сваёй, вясковай школе, але хто б сказаў, чаму мова навучання была рускай. На ёй (трэба ж пахваліцца!) я, малая, спрабавала размаўляць і дома, але мама-нябожчыца строга абрывала мяне, казала: «Не ламі язык».

Зараз думаю, што менавіта так яна і многія іншыя мамы, баранілі мову, клапаціліся аб тым, каб з роднымі дзецьмі не гаварыць на розных, бо гэта ж, згадзіцеся, ненатуральна.

Аднак пазіцыя такая была не ва ўсіх. Большасць і мам і дзяцей «плыла» і «плыве» па цячэнню. Таму ў нашым Лучыне жывой беларускай мовы ўжо, лічы, не пачуеш. Толькі па радыё, ды са старонак «Звязды».

Я яе выпісваю гадоў, мо, з дваццаць. Вельмі ўдзячна газеце за тое, што навучыла мяне гаспадарыць (агарод у мяне — гультаям на зайздрасць), што прывучыла думаць і бачыць прыгажосць. Можа, з «падачы» Анатоля Клешчука, Яўгена Пясецкага я пачала здымаць, захапляцца фатаграфіяй, з падачы Валянціны Доўнар пісаць у рубрыку «Алё, народ на провадзе!».

Па магчымасці я прапагандую газету сярод вяскоўцаў, сярод сваёй радні, угаворваю падпісацца. Не заўсёды, на жаль, але гэта ўдаецца.

Вось і думаю, а калі б угаворвалася не толькі я, калі б усе мы, сённяшнія падпісчыкі? Заўтра б нас стала больш, потым яшчэ і яшчэ. А там, глядзіш, і загучала б мова, ажылі б беларусы, як асобная, самастойная нацыя, адрозная ад іншых вельмі многім. І найперш — сваёй моваю.

Хто за?

Соф'я КУСЯНКОВА, «фанатка» газеты «Звязда»

в. Лучын, Рагачоўскі раён

Ад рэдакцыі. *Разам з лістом ад Соф'і Парфір'еўны прыйшоў... падарунак — вялікая і проста шыкоўная дошка, уласнымі рукамі адгабляваная, адфрэзераваная. Ды яшчэ і з «аўтографам»: «Шаноўнай «Звяздзе» — роднай газеце на роднай мове на добры век — з павагай і адданасцю.*

Што датычыцца фатаграфій, то замест яе аўтар прапанавала змясціць вось гэты кусток. З прыпіскай: «Так я бачу сябе, так бачу газету, так бачу мову — пад высокім небам, на сямі вятрах, але з вельмі моцным карэннем».

Рэпарцёр атрымаў заданне...

НАБЫЦЬ ЦЭГЛУ І БЛОКІ

У вёсцы ў маці наспела неабходнасць перакласці печы: яны «адпрацавалі» ўжо без малога па дваццаць гадоў і адкладваць справу стала немагчымым. Таму яшчэ ўзімку пачаў «піліць» брата, маўляў, трэба па магчымасці хутчэй закупляць самае неабходнае з патрэбных матэрыялаў, бо ўжо тады хадзілі чуткі пра магчымы дэфіцыт і павелічэнне цэн на іх з-за падаражання энерагарэсурсаў. Па аб'ектыўных прычынах ушчыльную ўзяцца за гэту справу атрымалася толькі каля месяца таму.

...Першы раз, наняўшы грузавую аўтамашыну, брат выехаў у сталіцу на завод будаўнічых матэрыялаў недзе ў 5.30 раніцы. На месцы — каля магазіна пры прадпрыемстве — былі каля 7 гадзін. Высветлілася, што наш нумар уваходзіць у чацвёрты дзесятак чаргавікоў. Якія людзі бавілі за размовамі час побач? Тыя, каму цэгла (2—3 паддоны) была патрэбна для сябе, для нейкіх будаўнічых ці рамонтных работ. Але хапала і перакупшчыкаў, якіх добра ведалі ў твар і па імёнах супрацоўнікі магазіна і ахова (гэтыя бралі па максімуму — па 6 паддонаў цэглы). Паводле слоў бывальцаў, у продаж кожны дзень давалі розную колькасць цэглы розных марак, але ў сярэднім — 30—40 паддонаў. З улікам нумара нашай чаргі, выходзіла, што вяртацца ў той дзень нам давядзецца ні з чым. Так яно і атрымалася: цэгла скончылася недзе на 15-м чалавеку, праз дзве гадзіны пасля адкрыцця магазіна. Балазе, атрымалася запісацца ў чаргу назаўтра (першы спіс згубіўся, потым на фірменным бланку складалі другі, у выніку мы запісаліся пад нумарам 7). Каб не гнаць грузавік паражняком (кожны рэйс — грошы), тут жа ўзялі глiны па 18 тысяч рублёў за тону. А потым заехалі да прыватніка ў пасёлак Ждановічы, дзе купілі для топак 180 штук спецыяльнай вогнетрывалай цэглы па 2150 рублёў за адзінку. (Я потым доўга жартаваў, што, прадаючы цагліну па «баксу» за штуку, маглі б яе і ў пакецік які асобна пакласці.) Вогнетрывалую цэглу можна было б набыць і ў магазінах, але там яна каштавала крыху даражэй — па 2400 рублёў.

...Назаўтра прыехалі крыху пазней — да 7.30 раніцы. Зноў была чарга, але як толькі ў 8 гадзін адкрыўся магазін, ахоўнік пачаў прапускаць чаргавікоў па складзенаму ўчора спісу. Мы ўзялі тры паддоны «двухсоткі» (350 цаглін на кожным; з улікам 180 штук вогнетрывалай і 400 штук звычайнай з ранейшых «хатніх» запасаў матэрыялу нам павінна было хапіць) па 524 рублі за штуку. Словам, не без пэўных цяжкасцяў (пра дэфіцыт таго ж цэменту мы нядаўна таксама пісалі), але сёе-тое з патрэбнага мы ўжо назапасілі.

Але ж праблема вышэйпералічанымі матэрыяламі не абмяжоўваецца. Мы бачым, што літаральна ў кожнай вёсцы, гарадку зараз вядзецца будаўніцтва, рамонтныя работы. Прычын таму, думаецца, некалькі. Бясспрэчна, дабрабыт многіх за апошні час палепшыўся і ўслед за набыццём новай мэблі, бытавой складанай тэхнікі, аўтамабіляў надышла чарга рамонту ці будаўніцтва жылля. Да таго ж многія будматэрыялы сталі больш даступнымі (узяць хоць бы тыя вокны-шклопакеты з ПВХ, якія цяпер ці не ў масавым парадку ўстанаўліваюць не толькі ў гарадскіх кватэрах, а і ў вясковых хатах). Але асноўная прычына — трохгадовы тэрмін, адведзены для будаўніцтва жылля на атрыманых зямельных участках. Вось і кінуліся людзі ў масавым парадку ў магазіны ды на рынкі. А што могуць прапанаваць прадпрыемствы будаўнічай галіны, дакладней, як задаволіць узніклы павялічаны попыт?

Напрыклад, як нам паведамілі на Мінскім заводзе будаўнічых матэрыялаў, магутнасці прадпрыемства загружаны на ўсе 100 працэнтаў «і нават крыху больш». Але попыт павялічыўся за апошні час на ўсе віды прадукцыі — тую ж цэглу. З пачатку года і па сёння — у 2,7 раза ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Цэглу, канешне, набыць можна, але (як у нашым выпадку) па папярэдняму запісу.

Калега, з'ездзіўшы дадому ў Глыбоцкі раён, сказаў, што знаёмыя сутыкнуліся з падобнай праблемай — немагчымасцю набыць сілікатныя блокі. Нават у сталіцы шукалі, але ўсё, што даведаліся — вядзецца запіс ажно на восень. Пра тое ж асабіста я чуў ад вадзіцеля грузавіка, які дастаўляў з месяц таму нам цэглу: раз-пораз яго просяць аказаць транспартныя паслугі, таму ён, як кажуць, у тэме.

Тэлефаную на камбінат сілікатных вырабаў. Адказны работнік быў нешматслоўным, ад падрабязных каментарыяў адмовіўся, але пацвердзіў, што праблема існуе. «Так, запіс на набыццё блокаў вядзецца на восень». На які дакладна месяц, назваць адмовіўся. «Праблема дэфіцыту будаўнічых матэрыялаў датычыцца не толькі нашага асобна ўзятага прадпрыемства, але і ўсёй галіны, у цэлым будаўнічых арганізацый. Ва ўрадзе аб ёй ведаюць, яе па даручэнню кіраўніка дзяржавы вывучае Дзяржкантроль. Таму я не хацеў бы яшчэ нешта каментаваць раней часу».

...Будаўнічыя, рамонтныя работы зараз «шырокім фронтам» вядуцца не толькі ў прыватным сектары, на раней і нядаўна выдзеленых зямельных участках. Тэмпы і аб'ёмы будаўніцтва жылля ў гарадах за апошнія гады таксама павялічыліся: шмат людзей сталі шчаслівымі ўладальнікамі ўласных квадратных метраў. Але нават кватэра, пабудаваная з адстройваннем, у дбайнага гаспадара «запросіць» пэўнага ўмяшання з мэтай добраўпарадкавання. Што ўжо гаварыць пра «голую каробку», якая патрабуе комплекснага рамонту. Дзеля цікаўнасці патэлефанаваў у фірму, у якой напрыканцы 2004 года сам заказваў «музыку» на ўласнай новабудоўлі. На старой памяці задаў некалькі пытанняў. Многія ж, хто робіць рамонт, часцяком заказваюць патрэбныя будаўнічыя матэрыялы менавіта праз такія фірмы (не бясплатна, зразумела, але ёсць эканомія часу, паслугі па дастаўцы і г.д.). Майстар адказаў, што асабліва праблем тут няма, хіба толькі што раз-пораз узнікаюць непразумення з цэментам, ды і падаражэў ён за апошні час — з 10 да 18 тысяч рублёў за мех вагой 50 кілаграмаў. Але і яго можна адшукаць (за гэта, у прынцыпе, кліент і плаціць прыватніку). А вось кошт на асноўныя віды рамонтных і будаўнічых работ за апошні час, паводле слоў суразмоўцы, павялічыўся недзе на 40 працэнтаў. Але, паколькі жылля будуецца шмат, попыт на работы нават пры такім «раскладзе» застаецца стабільна высокім.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Открытое акционерное общество «Брандко»

УНП 800002642

220021 РБ г. Минск, ул. Центральная, д. 46

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 1 ЯНВАРЯ 2007 Г.

АКТИВ	Код стр.	На начало отчетного года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства (01, 02)	110	123,0	916,0
Вложения во внеоборотные активы (07, 08, 16, 60)	140	21,0	45,0
ИТОГО по разделу I	190	**144,0**	**961,0**
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	118,0	357,0
в том числе: сырье, материалы и другие аналогичные ценности (10, 14, 15, 16)	211	40,0	169,0
незавершенное производство (издержки обращения) (20, 21, 23, 29, 44)	213	78,0	188,0
Налоги по приобретенным ценностям (18, 76)	220	141,0	235,0
Готовая продукция и товары (40, 41, 43)	230	1 297,0	3 854,0
Товары отгруженные, выполненные работы, оказанные услуги (45, 46)	240	767,0	736,0
Дебиторская задолженность	250	489,0	675,0
в том числе: расчеты с покупателями и заказчиками (62, 63)	251	123,0	238,0
расчеты с разными дебиторами и кредиторами (76)	253	277,0	313,0
прочая дебиторская задолженность	254	89,0	124,0
Финансовые вложения (58, 59)	260	127,0	-
Денежные средства (50, 51, 52, 55, 57)	270	28,0	112,0
ИТОГО по разделу II	290	**2 967,0**	**5 969,0**
БАЛАНС	390	**3 111,0**	**6 930,0**

ПАССИВ	Код стр.	На начало отчетного года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
III. ИСТОЧНИКИ СОБСТВЕННЫХ СРЕДСТВ			
Уставный фонд (80)	510	7,0	250,0
Добавочный фонд (83)	530	37,0	81,0
Нераспределенная прибыль (84)	540	244,0	342,0
ИТОГО по разделу III	590	**288,0**	**673,0**
IV. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Расходы будущих периодов (97)	620	-14,0	-16,0
Доходы будущих периодов (98)	630	8,0	8,0
ИТОГО по разделу IV	690	**-6,0**	**-8,0**
V. РАСЧЕТЫ			
Краткосрочные кредиты и займы (66)	710	1 075,0	3 063,0
Долгосрочные кредиты и займы (67)	720	487,0	475,0
Кредиторская задолженность	730	1 267,0	2 727,0
в том числе: расчеты с поставщиками и подрядчиками (60)	731	1 153,0	2 523,0
расчеты по оплате труда (70)	732	26,0	32,0
расчеты по прочим операциям с персоналом	733	2,0	-
расчеты по налогам и сборам (68)	734	35,0	-
расчеты по социальному страхованию и обеспечению (69)	735	12,0	11,0
расчеты с разными дебиторами и кредиторами (76)	737	39,0	161,0
ИТОГО по разделу V	790	**2 829,0**	**6 265,0**
БАЛАНС	890	**3 111,0**	**6 930,0**

Справка о наличии ценностей, учитываемых на забалансовых счетах	На конец отчетного периода
Амортизационный фонд воспроизводства основных средств (010)	47,0

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ С 1 ЯНВАРЯ 2006 Г. ПО 31 ДЕКАБРЯ 2006 Г.

Наименование показателей	Код стр.	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
1	2	3	4
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	**8 289,0**	**6 086,0**
Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	020	1 479,0	1 035,0
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей) (010-020)	030	**6 810,0**	**5 051,0**
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	040	4 210,0	3 757,0
Расходы на реализацию	060	2 075,0	903,0
Прибыль (убыток) от реализации (030-040-050-060)	070	**525,0**	**391,0**
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	080	1 831,0	1 235,0
Налоги, включаемые в операционные доходы	090	7,0	10,0
Операционные доходы (за минусом НДС, иных аналогичных обязательных платежей) (080-090)	100	1 824,0	1 225,0
в том числе: доходы, полученные от продажи активов (кроме ценных бумаг и иностранной валюты)	101	172,0	55,0
прочие операционные доходы	104	1 652,0	1 170,0
Операционные расходы	110	1 821,0	1 224,0
в том числе: расходы, полученные от продажи активов (кроме ценных бумаг и иностранной валюты)	111	167,0	54,0
прочие операционные расходы	113	1 654,0	1 170,0
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (100-110+/-120)	130	**3,0**	**1,0**
Налоги, включаемые во внереализационные доходы	150	-	4,0
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	140	17,0	24,0
Внереализационные доходы (за минусом НДС, иных аналогичных обязательных платежей) (140-150)	160	17,0	20,0
Внереализационные расходы	170	55,0	21,0
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (160-170+180)	190	**-38,0**	**-1,0**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) ЗА ОТЧЕТНЫЙ ПЕРИОД (+/170+/-130+/-190)	200	**490,0**	**391,0**
Налоги и сборы, производимые из прибыли	210	144,0	105,0
Расходы и платежи из прибыли	220	7,0	17,0
Сумма льготы по налогу на прибыль	230	-	27,0
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) К РАСПРЕДЕЛЕНИЮ (+/-200-210-220-230)	240	**339,0**	**242,0**

СПРАВКА. РАСШИФРОВКА ОТДЕЛЬНЫХ ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫХ ДОХОДОВ И РАСХОДОВ

Наименование показателей	Код стр.	На конец отчетного периода	
		Доходы	Расходы
1	2	5	6
Штрафы, пени, неустойки по неисполнению хозяйственных договоров	172	3,0	
Списанная дебиторская и кредиторская задолженность	173		6,0
Курсовые и суммовые разницы	174	11,0	17,0
Недостачи, потери и порча активов	176		6,0
Прочие доходы и расходы	178	3,0	26,0

Руководитель Лизунов С.А.
Главный бухгалтер Лизунова О.М.

Мінскі абласны выканаўчы камітэт глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю вядучага спецыяліста аддзела механізацыі і электрыфікацыі жывёлагадоўлі ААТ «Мінскаблаграсэрвіс», былога галоўнага саветніка-інспектара старшыні аблвыканкама, доктара сельскагаспадарчых навук Уладзіміра Барысавіча ІОФЕ і выказвае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

Прадам ГАЗ-31029 «Волга» 1995 г.в., чорны, 135 тыс. км, добры стан, 950 у.а., торг, тэрмінова. Тэл. 8-029-319-97-11.

Адукацыя

Пры рэгістрацыі на ЦТ выявілі 500 «двайнікоў»

Усяго тыдзень застаўся ў беларускіх абітурыентаў для таго, каб зарэгістравацца для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні.

— Хачу папярэдзіць, што 2 чэрвеня мы ўжо не будзем прымаць дакументы ў абітурыентаў, якія па нейкай прычыне спазніліся з рэгістрацыяй, — падкрэсліў у гутарцы з журналістам «Звязды» дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай Фяськоў. — Тэрміны рэгістрацыі на цэнтралізаванае тэсціраванне запісаны ў Правілах прыёму ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, і мы не збіраемся іх парушаць. Хоць, як сведчыць вопыт папярэдніх гадоў, заўсёды знойдзецца з дзесятак маладых людзей, якія будуць даказваць, што яны нічога не ведалі пра рэгістрацыю. Нават калі ў будучага абітурыента няма магчымасці асабіста зарэгістравацца для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні, напрыклад, ён зараз знаходзіцца ў бальніцы, гэта могуць зрабіць за яго бацькі — галоўнае, каб у іх на руках быў пашпарт дзіцяці, на які будзе выпісвацца пропуск у пункт правядзення тэсціравання. Звяртаю ўвагу, што пункты рэгістрацыі будуць працаваць таксама і ў нядзелю 27 мая. Так што спяшайцеся...

Дарэчы, да заканчэння тэрміну рэгістрацыі абітурыенты маюць права здаць свой пропуск ці абмяняць яго на пропуск па іншай вучэбнай дысцыпліне. Пропуск лічыцца зарэгістраваным толькі калі на ім маецца пячатка ўстановы, вызначанай пунктам тэсціравання, подпіс упаўнаважанага прадстаўніка пункта рэгістрацыі і ўказаны рэгістрацыйны нумар. На пачатак гэтага тыдня было выдадзена ўжо больш як 400 тысяч пропускаў на цэнтралізаванае тэсціраванне. Колькасць жадаючых здаць на ЦТ матэматыку перавысіла 91 тысячу чалавек. На цэнтралізаванае тэсціраванне па рускай мове зарэгістраваліся больш за 84 тысячы чалавек, а на цэнтралізаванае тэсціраванне па беларускай мове — 59 тысяч чалавек. Такім чынам разрыў паміж колькасцю жадаючых здаваць рускую і беларускую мову з кожным годам працягвае расці.

Мікалай Фяськоў таксама паведаміў, што яны выявілі сярод прайшоўшых рэгістрацыю 1,5 тысячы дзесяцікласнікаў, якія не маюць права здаваць цэнтралізаванае тэсціраванне.

— Мы не перашкаджалі дзесяцікласнікам удзельнічаць у рэпетыцыйным тэсціраванні, але цэнтралізаванае тэсціраванне — гэта ўжо фактычна прыёмная кампанія, удзельнічаць у якой могуць толькі асобы з агульнай сярэдняй адукацыяй, — патлумачыў спецыяліст. — І ў Правілах прыёму, і ў Палажэнні аб парадку правядзення цэнтралізаванага тэсціравання гэты пункт дакладна прапісаны. Таму асобы, якія яшчэ не скончылі сярэднюю школу, не будуць дапушчаныя да ўдзелу ў цэнтралізаваных тэставых выпрабаваннях. Таксама як не будуць дапушчаныя да ўдзелу больш чым у трох тэставых выпрабаваннях тыя маладыя людзі, якія паспрабавалі запасціся дадатковым пропускам. А такіх хітруноў мы выявілі ўжо каля 500 чалавек. Лішнія пропускі я параіў, бы пакуль не позна, вярнуць у цэнтры рэгістрацыі, каб не займаць там чужое месца і даць магчымасць зарэгістравацца іншым абітурыентам.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Сталіца

У ЧАС ВЫПУСКНОГА СПІРТНОЕ ПРАДАВАЦЦА НЕ БУДЗЕ

У час правядзення выпускных вечароў у Мінску будзе абмежаваны продаж спіртных напояў. У прыватнасці, рэалізацыя алкагольнай прадукцыі спыніцца пасля 18 гадзін вечара. Выпускны вечар школьнікаў сталіцы пройдзе 9 чэрвеня.

Намеснік старшыні камітэта па адукацыі Мінскага гарвыканкама Таццяна Злобіна адзначыла, што выпускны з'яўляецца культурным святам і павінен пакінуць толькі прыемныя ўспаміны: «Такія меры дапамогуць абмежаваць і бацькоў, і выпускнікоў ад непрыемных інцыдэнтаў у горадзе».

Нагадаем, што развітанне з дзяцінствам пройдзе сёлета ў сталічных выпускнікоў у школах. Як лічаць у гарвыканкаме, паслугі камбінатаў грамадскага харчавання не саступаюць якасці абслугоўвання ў рэстаранах. Дарэчы, каб пазбавіць бацькоў ад лішніх хваляванняў, з іх здымаюцца клопаты па афармленню свята. А ў некаторых школах выпускныя вечары будуць арганізаваны ў сталовых. «Гэта дазволіць забяспечыць і якаснае абслугоўванне, і скараціць выдаткі бацькоў на арганізацыю вечара. Супрацоўнікі сталовых дасканала вывучылі попыт заказчыкаў і распрацавалі добрае меню», — адзначыла Таццяна Злобіна.

Дзмітрый АЛЬФЕР.

Да ведама дарослых

Дрэнны прыклад — небяспечны

За 4 месяцы гэтага года на сталічных вуліцах у выніку дарожна-транспартных здарэнняў атрымалі раненні 29 дзяцей.

Як паведаміў начальнік упраўлення Дзяржаўтаінспекцыі ГУУС Мінгарвыканкама Васіль БУЛЬБЯНКОЎ, асноўная віноўнікі ДТЗ з удзелам дзяцей — дарослыя. Нават калі маленькія пешаходы самі парушылі Правілы дарожнага руху (ПДР), адказнасць, найперш маральная, ляжыць на нас, дарослых. Бо мы не папярэдзілі, не навучылі, не стварылі спрыяльных умоў для бяспекі маленькіх пешаходаў і пасажыраў. Я ўжо не кажу пра выпадкі, калі дзеці становяцца ахвярамі грубых парушальнікаў ПДР. Напрыклад, днямі ў Мінску п'яны матацыкліст на пешаходным пераходзе збіў 6-гадовую дзяўчынку. Больш за тое, ён спрабаваў збегчы з месца здарэння, але быў затрыманы бацькам пацярпелай.

Дарэчы,

Чым больш хочацца замуж, тым далей можна быць ад уяўлення гэтай ідэі. У тым і парадокс жыцця: калі нечага вельмі хочацца, яно не даецца. Аднак, акрамя парадоксу, трэба прызнаць і факт нашай вельмі нізкай псіхалагічнай «загартоўкі». Мужчыны і жанчыны могуць быць «выдатнікамі» на працы і «двоечнікамі» ў асабістым жыцці. Усё таму, што пошукі адказу на пытанні «хто я?» і «навошта я так раблю?» застаюцца ці не самымі складанымі... Пра асабістае жыццё, ролю сэксу ў ім і пошук сямейнага шчасця расказвае клінічны псіхолаг-сэксолаг Навукова-даследчага інстытута медыка-сацыяльнай экспертызы і рэабілітацыі Марына ДЫМКОЎСКАЯ.

— Наогул з біялагічнай пазіцыі любая жанчына здольная жыць з любым мужчынам, і наадварот. Але гэтага не адбываецца, таму што ўсе мы не проста надта розныя, а кожны, як кажуць, са сваёй «кашай» у галаве. Напрыклад, традыцыйна жанчыны цярпліва чакаюць прапановы...

— У які момант чалавек павінен адчуць, што «выспеў» для шлюбу?

— Паводле некаторых даследаванняў, на працягу 1—2 гадоў адносінаў у партнёраў павінна ўзнікнуць жаданне аб'яднацца ў пастаянную пару. Калі гэтага не адбылося, то можа не адбыцца і пазней. На момант нараджэння жадання ўзяць шлюб трэба як мага больш даведацца адзін пра аднаго і быць адказным хоць бы ў дачыненні да самога сябе.

— Сумеснае пражыванне напярэдадні шлюбу можа быць карысным?

— Можна паехаць на месяц-другі на поўдзень ці дачу. Першыя тыдні яшчэ будуць захоўвацца маскі, а далей пакрысе пачне выяўляцца рэальнае аблічча. Падчас паездкі можна даведацца, як ставіцца да цябе партнёр, пра яго звычкі і ўклад жыцця. Гэта добрае выпрабаванне. Калі пара не вытрывае яго, значыць, «саюз» можа і не скласціся. Усё бывае добра да таго часу, пакуль абодвум партнёрам камфортна.

— А як вызначыць, з кім у сэксуальным сэнсе нам будзе больш камфортна?

— Для камфортных адносінаў важна, каб супадаў тэмперамент, палавая канстытуцыя, ролевыя чаканні — сацыяльныя ролі, тып асобы — установкі і паводзіны, псіхасэксуальныя асаблівасці. Напрыклад, формулу вашай асабістай палавой канстытуцыі, асаблівасці тэмпераменту, характару і г.д. можна разлічыць падчас індывідуальнай кансультацыі. Увогуле, паводле даследаванняў, жанчыны аддаюць перавагу так званым «паўнакроўным самцам» — шыракаплечым, з масіўнай сківіцай. Чым вышэй, мацней, тым больш вынослівы, а такі дасць нам здаровае патомства і дапаможа яго вырасціць. Мужчыны скіраваныя на жанчын з шырокімі клубамі, паўнагрудых і абавязкова з таліяй. Такія ў стане вынасіць, нарадзіць і выкарміць здаровае дзіця. Дарэчы, згодна з нядаўнім даследаваннем у ЗША, каля 57 працэнтаў жанчын аддаюць перавагу валасатым, з «жывоцікам» мужчынам. Аднак усё гэта вельмі агульныя прыкметы. Кожная пара — гэта індывідуальны набор пэўных вартасцяў і характарыстык. І першапачаткова іграе ролю ўзаемная прывабнасць.

— Які шлюб можна лічыць першапачаткова больш удалым — той, што зарэгістраваны ва ўзросце «каля дваццаці» ці «каля трыццаці»?

— Зараз у нас, як правіла, назіраюцца два віды шлюбаў: ранняя, як кажуць, «па абставінах», калі партнёры не гатовыя несці адказнасць не тое што за іншага чалавека, але нават за сябе, і познія, больш свядомыя і абдуманыя...

— Аднак гадоў да трыццаці ў чалавека назапасіцца немалая колькасць палавых партнёраў. Гэта не нашкодзіць новым узаемаадносінам?

— Чалавек павінен прыйсці да разумення, што ён гатовы жыць у шлюбе, лічыцца з другім чалавекам і захоўваць яму вернасць. Такі чалавек мае пэўны вопыт не толькі пра іншых — якія яны бываюць, але і пра сябе — што мне патрэбна. Тэарэтычна можна ажаніцца і цнатлівымі, паколькі гарманічная сям'я будуецца не столькі на сэксе, колькі на асэнсаваным ра-

Позірк жаночы...

ШУКАЮ ПА́РУ!

або На кожны тавар — свой купец

зуменні патрэбы ў такіх адносінах. Але тым, хто меў нейкі вопыт узаемаадносінаў да шлюбу, усё ж прасцей дамаўляцца і адаптавацца адно да аднаго.

— У гэтай самай адаптацыі, здаецца, і хаваецца падмурак трывалага шлюбу...

— Інакш чалавек не выжыў бы як від... Тут усё залежыць ад індывідуальных асаблівасцяў: адны — больш гібкія, а другія — абсалютна не здольныя на кампраміс.

— Так ці інакш — дзякуй бацькам?

— Калі гавораць пра фарміраванне асобы, то можна прытрымлівацца наступнай схемы: 20 працэнтаў — генетыка, 20 — тэмперамент, тая асаблівая нервовая сістэма, з якой мы нараджаемся і 60 — сацыяльны асяродак, у першую чаргу, бацькі. Значыць, кожны з нас ёсць у многім тое, да чаго імкнуліся нашы бацькі, наша акружэнне. Нездарма раней шлюбы браліся выключна з прадстаўнікамі аднаго саслоўя — у іх адны мэты, жыццёвыя традыцыі, лад жыцця, шырыня поглядаў і матэрыяльнае становішча.

— Калі ў пары з'яўляюцца праблемы, мала хто хоча разбірацца і шукаць выйсце са складанага становішча. Прасцей разбегчыся або пайсці налева...

— Канешне, прасцей. На размову патрэбна мужнасць. Аднак, амаль кожны з нас пакутуе ад тайных страхаў — страху аказацца аднаму, страху быць незразумелым і г.д.

— А чаго мужчыны так баяцца, калі здраджваюць у перыяд з'яўлення ў сям'і дзіцяці?

— Мужчына і жанчына з'яўляюцца ў сваіх адносінах замкнёнай сістэмай. Сам па сабе факт нараджэння дзіцяці — адзін з крызісных момантаў у сям'і. Усё мяняецца, самі маладыя бацькі мяняюцца. А ён чуе «мне не да цябе, я стамілася». Зразумела, калі абодва думаюць толькі пра сябе, узнікне канфлікт, і ён будзе нарастаць. Ёсць прынцып размеркавання «энергіі» ў сям'і: колькі ты аддаеш, роўна столькі павінен і атрымліваць. Інакш — не камфортна.

— Як вярнуць мужа ў сям'ю?

— Мужчынам магу сказаць, што дарога назад заўсёды адкрытая. Калі гэта быў выпадковы «эпізод», то шлюб можа існаваць далей. Але каяцца я раю толькі ў тым выпадку, калі сталі вядомы падрабязнасці справы, калі ж не — трымайце, калі ласка, «шкілет» у шафе. Хлусня ў імя выратавання — гэта той выпадак. Калі ж гаворка ідзе пра перманентную, хранічную здраду, то варта падумаць, ці хачу я жыць так з гэтым чалавекам. Калі немагчыма змяніць сітуацыю, варта змяніць стаўленне да яе, паглядзець на тое, што адбываецца, з іншага боку, з іншым настроем.

— А чаму некаторыя людзі наогул не бяруць шлюб?

— Карані такога становішча варта шукаць у той сям'і, дзе вырас хлопчык або дзяўчынка. Штосьці там было не на карысць падобных узаемаадносінаў... Страх перад той жа жаніцьбай павінен быць на нечым заснаваны. Яго трэба выявіць, усвядоміць, папрацаваць над ім і пазбавіцца яго. Магчыма, жаніхі-нявесты з'явяцца не адразу, але працэс пойдзе ў патрэбным накірунку. Калі са страхам немагчыма справіцца самастойна, трэба клікаць на новае жыццё. У другім варыянце, значна больш складаным, варта змагацца з хваробай, і змагацца РАЗАМ. Калі РАЗАМ — немагчыма, то гэта будзе бясконцая барацьба аднаго чалавека супраць другога. Жонкі алкаголікаў, як правіла, «мяккія і пушыстыя», але і не дамагальныя, без прэтэнзій, многія з іх выйшлі з сем'яў, дзе адзін ці абодва бацькі злоўжывалі алкаголем. У такой жанчыны не было перад вачыма іншага прыкладу.

— Здаецца, нацярпелася, колькі ж можна?

— Нацярпелася, але адчувае сябе камфортна толькі ў знаёмых ёй сітуацыях. — калі значная для яе асоба ўжывае алкаголь. Пры іншым раскладзе яна проста не ведае, як сябе паводзіць, бо не мае вопыту ўзаемадзеяння з непітушчымі.

— Дарэчы, алкагольная залежнасць аднаго з партнёраў «разбіла» не адну сям'ю. Ці можна ў няпоўнай сям'і выхаваць будучага шчаслівага сямейніка?

— Такім дзецям значна складаней будаваць сваю сям'ю. Многае залежыць ад таго, у якім узросце яны застаюцца без аднаго з бацькоў. Бо перш-наперш у сям'і фарміруецца шаблон адносінаў. Калі таты ці мамы побач няма, «шаблон» усё роўна сфарміруецца, але пытанне ў тым, хто стане значным дарослым для дзіцяці. Замену бацьку дзіця будзе шукаць сярод сваякоў матулі, яе сяброў або... вулічных лідараў старэйшага ўзросту.

— Відавочна, паўнацэнная бацькоўская сям'я можа паспрыяць і таму, каб іх дзіця выбрала «лепшага з лепшых»...

— Канешне. Для гэтага неабходна як мага даўжэй захоўваць давяральныя адносіны з падлеткам. На жаль, бацькам больш выгадна стаяць на пазіцыі «я — вялікі, мне лепей бачна». Не сакрэт, што мы, дарослыя, уладкоўваем сваё жыццё так, як зручна нам, дзеці разглядаюцца як частка нашага жыцця. А дзіця — гэта Чалавек, хоць і маленькі, са сваімі асаблівасцямі, радасцямі і бедамі. Нялішне будзе прыгадаць сябе ў падлеткавым узросце, расказаць свайму дзіцяці пра свае цяжкасці, радасці, імкненні і інтарэсы ў той час. Магчыма, гэта стане першым крокам да ўзаемаразумення. І, канешне, бацькі павінны цікавіцца справамі дзяцей, адносінамі з равеснікамі. Толькі не з пазіцыі наглядчыка, а па-сяброўску. Навучыцца быць сябрамі — гэта праца.

— Як вы ставіцеся да навамоднага жадання некаторых дзяўчын, якім не шчасціць выйсці замуж, нарадзіць дзіця «для сябе» ад палюбоўніка?

— Мы зноў загаварылі пра адказнасць за свае ўчынкі. Жанчына, якая прымае такое рашэнне, павінна разумець, з якімі цяжкасцямі можа сутыкнуцца, і загадзя вызначыць для сябе шляхі іх пераадолення.

Гутарыла Святлана БАРЫСЕНКА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Гульня № 1

«МІЛАН» АДПОМСЦІЎ «ЛІВЕРПУЛЮ»

Мацнейшая зборная свету — Італія, лепшы клуб у Еўропе — італьянскі

Кубак чэмпіёнаў у руках аўтара галоў Філіпэ Індзагі.

У сёлетнім фінале Лігі чэмпіёнаў у Афінах «Мілан» паставіў на месца «выскачку», які адабраў у італьянцаў кубак у 2005 годзе.

На паражэнне сваіх аднаклубнікаў Філіпа Індзагі тады глядзеў з лаўкі запасных. У гэтым фінале ён выйшаў на поле, каб не дапусціць паўтору таго матча і стаў аўтарам двух галоў. Праўда, першы, на 45-й хвіліне матча, аказаўся спрэчным: Андрэа Пірла прабіваў штрафны, трапіў у адзінага форварда ў складзе «Мілана» і мяч уляцеў у англійскія вароты. Ці то было плячо Індзагі, ці яго рука, пакінем на сумленні галоўнага арбітра паядынку Герберта Фандэля. Заўважу толькі, што ў матчах, якія абслугоўваў гэты нямецкі рэферы, італьянцы святкавалі перамогу ўжо пяць разоў.

На 82-й хвіліне гульні зноў вызначыўся Індзагі, а на 89-й «Ліверпулю» ўдалося размачыць лік (гол на рахунку Дзірка Куйта) — 2:1. «Мілан» узяў рэванш за фіяска двухгадовай даўніны (у складзе каманды ў фінале гулялі сем прайграўшых у 2005-м. — **Аўт.**) і ў сёмы раз стаў уладальнікам самага ганаровага клубнага трафея ў Еўропе. Па колькасці перамог у Лізе чэмпіёнаў «расанеры» ўступаюць толькі мадрыдскаму «Рэалу», які станавіўся мацнейшым на канцыненце 9 разоў. Цікава, што галоўны трэнер італьянцаў Карла Анчалоцці двойчы выйграваў Лігу чэмпіёнаў як ігрок «Мілана», а зараз здабыў другі па ліку кубак у якасці настаўніка каманды. Паола Мальдзіні ўпісаў сябе ў гісторыю футбола, бо ў другі раз прывёў сваю каманду да перамогі ў Лізе чэмпіёнаў у рангу капітана. Бразільскі паўабаронца «Мілана» Кака стаў лепшым бамбардзірам Лігі чэмпіёнаў (10 гадоў у 13 матчах). Для фанатаў «расанеры» і італьянскага футбола сёлетні поспех «Мілана» асабліва дарагі: пасля скандалу ў італьянскім футболе мацнейшай зборнай планеты становіцца Італія, а мацнейшым клубам на кантыненце — італьянскі «Мілан».

БРАСТАЎЧАНЕ ЭКАНОМЯЦЬ СІЛЫ?

У вышэйшай лізе чэмпіянату Беларусі па футболу не засталося каманд, якія б ні разу не святкавалі перамогу. У сёмым туры нарэшце выйграў «Віцебск» (ідзе на 12-м месцы). Віцябчанамі павержаны фіналіст Кубка краіны, брэсцкае «Дынама», — 1:0. Магчыма, футбалісты з берагоў Буга эканомяць сілы, каб заваяваць першы тытул у дэбютным для сябе фінале Кубка Беларусі 27 мая?

Ірына ПРЫМАК.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.52	21.22	16.30
Віцебск —	4.34	21.19	16.45
Магілёў —	4.42	21.12	16.30
Гомель —	4.46	21.01	16.15
Гродна —	5.08	21.36	16.28
Брэст —	5.17	21.29	16.12

Месяц

Першая квадра 24 мая.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Глікерыі, Ірыны, Аляксандра, Васіля, Георгія, Макара, Сяргея, Яфіма;*
К. *ДЗЕНЬ МАЦІ. Марыяны, Паўліны, Эвеліны, Паўла, Філіпа, Яна.*

Па звестках Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы БДУ

Прагнозныя значэнні УФ-індэкса для г. Мінска і Мінскай вобласці

	26 мая	27 мая	28 мая
Для бязвоблачнага неба	UV INDEX 5,9	UV INDEX 5,9	UV INDEX 6,0
З улікам прагназуемай воблачнасці	UV INDEX 5,3	UV INDEX 5,3	UV INDEX 5,4

Экстрэмальны ..... 11+
Вельмі высокі ..... 8 — 10
Высокі ..... 6 — 7
Умераны ..... 3 — 5
Нізкі ..... 1 — 2

З 11 да 15 гадзін дня час небяспечнага знаходжання на сонцы для людзей з адчувальным тыпам скуры:
26.05 — 20 мінут,
27.05 — 20 мінут,
28.05 — 20 мінут.

Надвор'е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	+26 — +28 °С	МАСКВА	+29 — +31 °С
ВІЛЬНЮС	+27 — +29 °С	РЫГА	+25 — +27 °С
КІЕЎ	+33 — +35 °С	С-ПЕЦЯРБУРГ	+23 — +25 °С

Без ападкаў

Усміхнёмся!

☺

Варажба на кухні інтэрната. Дзяўчаты ставяць смажыць бульбу кожная ў сваёй патэльні. З чыёй патэльні юнакі бульбу з'ядуць, тая і ідзе да іх у пакой сварыцца-знаёміцца.

☺

Размаўляюць дзве дамы:
— Усе мужыкі п'юць!
— А мой яшчэ і есць!

☺

93 працэнты людзей не могуць жыць без асабістага камп'ютара, 6 працэнтаў без тэлевізара і толькі 1 працэнт не можа жыць без ежы.

☺

— Дарагі, мне так не хочацца ісці ў госці да сваякоў.
— Мне таксама. Але ты ўяві сабе, калі мы не пойдзем, як яны абрадуюцца.
— Так. Трэба ісці...

... і мужчынскі

Нюансы такога невытлумачальнага паняцця, як жаночая логіка, даўно ўжо сталі пагалоскай і адной з любімых тэм сродкаў масавай інфармацыі. Дзіўна тое, што над унікальным паняццем «жаночая логіка» больш за ўсё смяюцца самі жанчыны. Нелагічнасць, ігнараванне фактаў і доказаў — вось асноўныя прынцыпы гэтай унікальнай з'явы.

ЯНЫ — НЕЗРАЗУМЕЛЫЯ...

Аднак аўтар гэтых радкоў не адносіцца да катэгорыі жанчынаненавіснікаў, тым больш не адносіцца да іх, хоць бы з прычыны свайго полу, і псіхолаг Святлана Сімановіч, з дапамогай якой і быў напісаны тэкст, які мы прапануем вашай увазе. Адзінае, аб чым хацелася б папрасіць чытача: успрымайце ўсё, што вы прачытаеце, з пачуццём гумару. Аднак, як вядома, у кожным жарце ёсць толькі частка жарту...

Вядома, што дваістае ўсведамленне з'яўляецца патапсіхічным парушэннем. Пры такіх парушэннях чалавек папераменна іграе дзве ці нават больш сацыяльных роляў, якія часам маюць дыяметральна процілеглыя якасці і характары. Пры гэтым індывід, іграючы адну ролю, катэгарычна адмаўляе сваю прыналежнасць да іншай. Такое змяненне асобы сустракаецца дастаткова рэдка і назіраецца ў асноўным у людзей з прыкметнымі псіхічнымі адхіленнямі. Дык вось, з пункту гледжання большасці жанчын (паўтараю, гэта сцвярджаю не я, а прафесійны псіхолаг-жанчына. — **Аўт.**) ідэальны мужчына павінен валодаць прама процілеглымі якасцямі, гэта значыць валодаць тым самым дваістым усведамленнем. Не верыце? Гэта элементарна даказаць.

З пункту гледжання любой нармальнай жанчыны яе **мужчына павінен быць, па-першае, інтэлектуалам, па-другое, майстрам на ўсе рукі.**

Любой жанчыне прыемна, калі яе спадарожнік **памятае не толькі назвы каманд,** якія ўваходзяць у футбольную турнірную табліцу, але і **разбіраецца ў класічнай музыцы,** някепска ведае японскую **паэзію** і нават помніць, як называецца сталіца Гвіяны (Джорджтаўн, калі для кагосьці гэта важна). Успомніце: большасць жанчын на пытанне аб самых важных мужчынскіх якасцях на адно з першых месцаў паставіць праславуты «розум». Але высокі IQ зусім не патрэбны для таго, каб памяняць пракладку ў кране, які цячэ, ці ўмацаваць электрычную разетку ў сцяне. Аднак жанчыны гэтага не разумеюць.

Ідэальны мужчына, на іх погляд, павінен аднолькава добра **разбірацца ў рухавіках унутранага згарання і быць уладаром прыза «хрустальнай савы»** ў вядомым клубе інтэлектуалаў.

Ідзём далей. На погляд большасці жанчын, яе спадарожнік павінен быць **вельмі працавітым,** але ў той жа час **валодаць дастатковай колькасцю вольнага часу,** які, зразумела, цалкам павінен быць **прысвечаны сям'і і дому.**

Мужык, які ляжыць на канапе з газетай, стаў любімай ілюстрацыяй такіх модных сёння ток-шоў, асноўнымі ўдзельнікамі і масоўкай-клікушамі ў якіх з'яўляюцца менавіта жанчыны. Мужчына на канапе (чытай — гультай) выклікае ў жанчын прыступ мала кантралюемай агрэсіі. Ім тут жа пачынае здавацца, што мужчына бяздарна і бязмэтна марнуе сваё (і яе таксама) галоўнае багацце — час. Але... паспрабуйце адмовіцца ад бесталковых вячорак у кампаніі з яе сяброўкамі, спаслаўшыся на тое, што трэба «дабіць» справаздачу! «Працуй у рабочы час!» — такім будзе адказ. Адмоўцеся ад паходу ва ўнівермаг (о, гэтыя бясконцыя прымеркі!), матывуючы гэта тым, што трэба памяняць петлі ў дзверцах шафы! Менавіта таму такія няшчасныя жонкі заўзятых працаголікаў: і грошы быццам у доме ёсць, і жонка апранутая-абутая... Але ж не хапае прагулак пад месяцам і сумесных паездак на шашлыкі.

Ці павінен мужчына жаночай мары быць **смелым**? «А як жа!» — скажа любая жанчына, але ў той жа час ён павінен быць **вельмі асцярожным.**

Давайце адкрыем любы жаночы раман. Што мы там бачым? Правільна, праз кожныя тры старонкі галоўны герой крышыць сківіцы і наносіць асабліва цяжкія і менш цяжкія цялесныя пашкоджанні паганым малойчыкам. Аб гэтым пісалі і раней: спачатку былі высакародныя рыцары, якія праломвалі чарапы нягоднікам, пасля мушкецёры і сумленныя піраты, якія наколвалі ворагаў на шпагі, як энтамолаг матылькоў на шпількі, пасля «маёры ФСБ» і іншыя спецназаўцы ў адстаўцы. Звярніце ўвагу на тое, што як мінімум палова аўтараў гэтай муці — жанчыны і пішуць яны менавіта для жанчын, ведаючы, як нядрэнныя псіхолагі, што тым трэба. Аднак паспрабуйце выступіць пры сваёй даме супраць шайкі п'яных нягоднікаў... трэба тлумачыць далей? «Разумныя людзі вырашаюць канфлікты не кулакамі, а словамі»... «Трэба ўмець трымаць сябе ў руках»... ці нават: «Я не бачу сябе ў ролі смуткуючай удавы забітага героя»... Хто з нармальных мужчын не ведае такія і ім падобныя словы?

Усе жанчыны хочуць, каб іх мужчына **быў шчодрым,** але разам з тым яны ўсяляк заклікаюць нас да **эканоміі сродкаў.** Помніце вядомую песню аб тым, як, расчуліўшыся, прадстаўнік свабоднай прафесіі прадаў усю сваю небагатую нерухомасць для таго толькі, каб купіць кучу кветак прадмету сваёй страсці. І далей: «Миллион-миллион-миллион алых роз...» любая жанчына марыць пра такога, але не вельмі здаровага паклонніка. Мужчынская шчодрасць цэніцца дамамі вельмі высока, нават калі дама зусім не меркантыльная. Але... Як толькі кішэня мужчыны афіцыйна пераходзіць пад юрысдыкцыю дамы, яе стаўленне да шырокіх жэстаў у корані мяняецца: «У мяне мюслі закончыліся, а ён тыгровых крэветак купіў...».

Любая жанчына цэніць у мужчыне такую якасць, як **надзейнасць** (прыгадайце хоць бы ўсё тыя ж ток-шоў), аднак вельмі рамантычным тыя ж самыя жанчыны лічаць **непрадказальнасць**. «Абаперціся на моцнае мужчынскае плячо...», «...моцныя і надзейныя мужчынскія рукі» — вось толькі некаторыя штампы, якімі стракаціць як жаночыя раманы, так і публічныя жаночыя выказванні. Прычым заўсёды (самімі ж жанчынамі) дапускаецца наступны парадак: мужчына — гэта сістэма, у той час як жанчына — гэта хаос і пры сумесным жыцці яны адзін аднаго ўраўнаважваюць. Традыцыйная жаночая міфалогія дапускае, што адзін мужчына лепш, чым два, і тым больш лепш, чым чатыры. Аднак жаночая парывістая натура пачынае вельмі пакутаваць, бачачы перад сабой усё той жа непадуладны часу ўцёс, што і дзесяць гадоў таму, усё ў тым жа пінжаку, з той жа прычоскай і з тым жа наборам жартаў і анекдотаў. У рэшце рэшт даме становіцца сумна.

«Мужчына павінен быць здольны на ўчынак», — скажа любая рамантычна настроеная асоба, пры гэтым пад «учынкам» звычайна разумеюцца лясныя суніцы ў студзені; спальня, упрыгожаная паветранымі шарамі; сумбурнае купанне ўначы ў гарадскім фантане і г.д.

Акрамя таго, любая з жанчын імкнецца, каб мужчына, які знаходзіцца побач з ёй, **многага дабіўся ў жыцці,** а значыць, каб яго пазнавалі і каб ён стаў славутым. Але ў той жа час вельмі цэніцца мужчынская **сціпласць**. Калі спадарожніка жанчыны пазнаюць, калі яго вітае шмат людзей, у тым ліку і незнаёмыя, яна проста сведчыць ад шчасця, пераносячы на сябе (часцей за ўсё небеспадстаўна) частку мужчынскага поспеху. Саюз з публічным мужчынам, якога ведаюць, абяцае даме вельмі насычанае жыццё: рознага кшталту тусоўкі, увагу прэсы, цікавыя сустрэчы і важныя прыёмы. Жанчыны, што ж граху таіць, усё гэта вельмі любяць. Аднак жаданне вызначыцца, маленькая пахвальба і лёгкае прыхарошванне сапраўднасці лічыцца дапушчальнай якасцю толькі для жанчын. Мужчына ж, які праводзіць каля люстэрка больш за тры секунды ў суткі, ужо выклікае скосыя позіркі і масу нараканняў.

Гэту тэму можна працягваць і працягваць, але агульны сэнс, думаю, чытачу зразумелы. Хачу адразу ж адбіць магчымы напад тых, хто практыкуе фемінізм: аўтар і псіхолаг, які яму дапамагаў, проста вырашылі пажартаваць.

Аляксандр АЧАРЭТНІ.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ДАПАМАЖЫ САБЕ САМ

Прэч стомленасць!

Аказаць элементарную дапамогу сваёй нервовай сістэме цалкам магчыма і без медыцынскай адукацыі, калі масіраваць пэўныя зоны на вушах.

● Перш-наперш вазьміце за правіла перад сном масіраваць вушы, паставіўшы падушачкі вялікіх пальцаў рук за мочкамі вушэй для фіксацыі. Працягласць масажу — не больш чым 3—4 хвіліны. Рухайцеся па кругу вушэй па гадзіннікавай стрэлцы, прыемна націскаючы на іх кругавымі рухамі пры дапамозе ўказальных пальцаў. Адно націсканне рабіце 1 раз у секунду. Такі масаж нармалізуе работу ўсяго арганізма і нервовай сістэмы, паскарае засынанне і паляпшае якасць сну. Асабліва карысна праводзіць працэдуру агульнага масажу вушэй пасля стрэсавай непрыемнай сітуацыі.

● Калі зранку вы адчуваеце сябе разбітым і дрэнна разумееце, ваш мозг яшчэ не прачнуўся і вы не можаце сабрацца з думкамі, то актывізуйце работу нервовай сістэмы пры дапамозе пагладжвання вушэй па краях. Трыма пальцамі — указальным, сярэднім і безыменным — рухайцеся знізу ўверх па краю вушэй. Вы павінны зрабіць 20—30 пагладжванняў на працягу 1—2 хвілін. Рабіце гэта спакойна, але старанна. Пасля гэтага пацягніце сябе за мочкі вушэй спачатку ўніз 3 разы, затым у бакі 3—4 разы, а напаследак вазьміцеся за верхнія часткі вушэй і пацягніце ўверх 3—5 разоў. Спецыялісты лічаць, што такая працэдура дзейнічае больш эфектыўна, чым кава, і пры гэтым яна бяспечная.

● Шмат тысячагоддзяў усходнія лекары выкарыстоўваюць спецыяльны прыём уздзеяння на вушы і патыліцу, каб зняць стомленасць у адказны момант. Гэты спосаб абуджэння ўсведамлення называецца «гром нябесных барабанаў». Заплюшчыце вочы, далоні пакладзіце на вушы так, каб пальцы пры гэтым аказаліся на патыліцы. Цяпер залажыце ўказальны палец за сярэдні «крыжыкам» і ўдарце гэтымі скрыжаванымі пальцамі сябе па патыліцы, не знімаючы далоні з вушэй. У час удару пачуецца глухі гук, падобны на гул. Ударце сябе рытмічна 12 разоў — ад гэтага ваша ўсведамленне зноў уключыцца ў работу.

ПАДКАЗКІ АГАРОДНІКАМ

Скрабок

Гэты арыгінальны інструмент, які вы бачыце на малюнку, прызначаны для знішчэння пустазелля. Рухаць яго трэба па паверхні глебы ад сябе — пустазелле зразаецца, а глеба пры гэтым застаецца некранутай. Такім скрабком добра чысціць дарожкі паміж градкамі.

Змайстраваць яго можна з дзвюх дэталяў: кавалка нажавачнага палатна і абрэзка трубы ад верхняй дугі старога ложка. Адным канцом труба прыкляпаная (або прывараная) да палатна, а ў другі ўстаўляецца дзяржанне.

-2415-

ДЛЯ ВАШАЙ КАРЫСЦІ

Знесла курачка яечка

Як, не разбіваючы яйка, даведацца, ці свежае яно? І ці праўда, што лепш за ўсё засвойваюцца «сённяшнія» яйкі, калі іх піць сырымі?

Спачатку аб тым, што і як засвойваецца. Аднолькава карыснымі лічацца ўсе яйкі, якім не больш чым пяць дзён ад роду. Таму з пункту гледжання засваяльнасці не важна, сённяшнія яны ці ўчарашнія. Розніца паміж імі ў іншым, і вы абавязкова яе адчуеце. Справа ў тым, што спецыфічны смакавы букет, якім, уласна, і адрозніваецца яйка, у нованароджаным прадукце адсутнічае, і на смак толькі што знесенае яечка ніякае. Узнікае такі букет пазней, праз дзень-два, як вынік работы ўнутрыяечных ферментаў. Гэта значыць, каб яйка, якое толькі што з'явілася на свет, стала не толькі карысным, але і смачным, яму трэба крыху даспець. Таму спецыялісты раяць аддаваць перавагу ўчарашнім яйкам. Калі яны знесеныя здаровымі птушкамі, то ўжываць іх сапраўды лепш у сырым выглядзе (не ўзбоўтваючы). Такія яйкі арганізм чалавека засвойвае ўсяго за 2 гадзіны. Сырое, але крыху прысоленае яйка ператраўліваецца на паўгадзіны даўжэй; 2 гадзіны 15 хвілін спатрэбіцца страўніку для перапрацоўкі яечні; 3 гадзіны 30 хвілін ідзе на крута зваранае яйка. Затое варанае яйка практычна не адрозніваецца ад сырога па саставу і колькасці нажыўных рэчываў. А вось іншыя віды апрацоўкі так ці інакш звязаны з іх стратай. У яйку, падсмажаным пры не вельмі высокай тэмпературы, страта пратэіну складае 1,5 працэнта ад першапачатковай колькасці, у амлеце — 3, у моцна падсмажанай яечні — да 9 працэнтаў. Што выбраць — вырашайце самі.

А цяпер аб тых няхітрых прыёмах, пры дапамозе якіх вы зможаце вызначыць прыблізны ўзрост яйка. Перш за ўсё ўважліва агледзьце яго: у свежага яйка паверхня скарлупіны матавая, у старых — яна бліскучыць, крыху адлівае сінім колерам. Далей падключыце язык: дакраніцеся ім да абодвух канцоў. У свежага яйка тупы канец цяплейшы, чым востры, а ў старога яйка тэмпература з абодвух канцоў аднолькавая.

Калі ж вы хочаце вызначыць больш дакладную дату з'яўлення яйка на свет, прапануем зрабіць так званую пробу на плаванне. Наліце ў невялікую каструльку 8-працэнтны раствор солі (8 г солі на 92 г вады) і апусціце ў яго яйка. Свежыя паводзінамі ў вадзе яно цалкам сябе выдасць. Такім чынам: яйка спакойна праляжала на дне каструлі ўвесь час — г. зн. яму ад 1 да 6 дзён; імкнулася падняцца, яго тупы канец адхіляўся ад дна прыкладна на 45° — ад 7 да 10 дзён; яйка амаль вертыкальна стаяла ў вадзе — ад 10 да 12 дзён; цалкам здавальняюча плавала — ад 13 да 17 дзён; вынырвала з вады, па-ранейшаму трымалася тупым канцом уверх — больш чым 17 дзён.

І яшчэ. Нават умовы, блізкія да ідэальных (маецца на ўвазе халадзільнік), дазваляюць захаваць на нейкі час толькі ўласцівасці яйка як харчовага прадукту, але ніяк не поўны аб'ём унікальнага запасу каштоўных рэчываў, якімі забяспечыла яго прырода. Даказана, у прыватнасці, што праз 30 дзён яйка губляе трэцюю частку гэтага запасу, таму ешце яго, пакуль яно свежае.

-2416-

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламад

Магілёўскі завод штучнага валакна:

ВОПЫТ СТАРЭЙШЫХ І ЭНЕРГІЯ МАЛАДЫХ

ЗШВ — гэта буйны хімічны комплекс, які ўваходзіць у сістэму канцэрна «Белнафтахім».

Прадпрыемства адлічвае сваю гісторыю з 1930 года. Яна пачалася з урачыстага пуску ў Магілёве шаўковай фабрыкі. Вытворчасць запрацавала на поўную магутнасць пасля заканчэння вайны. Акрамя віскознай ніткі, у 1950-я гады фабрыка стала выпускаць цэлафан.

Цяпер на заводзе штучнага валакна выпускаецца два асноўныя віды прадукцыі: гэта віскозная тэкстыльная нітка і поліпрапіленавая плёнка. Акрамя гэтага, завод сёння прапануе спажыўцам поліэтыленавую плёнку і тканіну з плёначнай ніткі.

Прадукцыя ЗШВ выкарыстоўваецца ў лёгкай, харчовай, тэкстыльнай і іншых галінах прамысловасці. Яе набываюць у Беларусі, а таксама ў краінах далёкага і блізкага замежжа. Асноўнымі рынкамі збыту віскознай ніткі з'яўляюцца краіны Паўднёва-Усходняй Азіі і Заходняй Еўропы: Афганістан, Турцыя, Пакістан, Германія, Польшча і іншыя. Асноўныя пакупнікі поліпрапіленавай плёнкі — Расія, а таксама Украіна і Казахстан.

Прадукцыя завода і сістэма менеджменту якасці сертыфікаваны на адпаведнасць патрабаванням СТБ ISO 9001-2001.

Сёлета на заводзе запушчана найноўшая тэхналагічная лінія нямецкай кампаніі «Kiefel», якая дазваляе выпускаць самыя сучасныя віды плёнак.

Работнікі завода: Тацяна ЦВІРКО, Мікалай САЛАЎЁЎ, Святлана СТАНКЕВІЧ, Валянціна ПРАЯВІНА і Андрэй ЦІМАШЭНКА.

Дырэктар ЗШВ Алег БУРАКОЎ:

«СКЛАДОВЫЯ ПОСПЕХУ: МАДЭРНІЗАЦЫЯ, ДАПАМОГА КАНЦЭРНА І ДОБРАЯ ПРАЦА»

Алег Буракоў — малады і энергічны дырэктар Магілёўскага завода штучнага валакна. Ён — ураджэнец Гомельшчыны, атрымаў адукацыю ў сталіцы, потым працаваў на гродзенскім «Хімвалакне». Хутка споўніцца год, як ён узначаліў завод у Магілёве. Алег Пятровіч і яго каманда — гэта кіраўнікі сучаснага стылю, дэвіз якіх — «Меней слоў — больш справы!»

Сёння дырэктар расказвае аб прадпрыемстве, аб яго працы і калектыве, аб цесных сувязях з канцэрнам «Белнафтахім» і шмат аб чым іншым.

— ЗШВ — адно са старэйшых прадпрыемстваў у Магілёўскай вобласці. За доўгія гады ў яго гісторыі былі і ўзлёты, і падзенні. Які сёння перыяд у прадпрыемства, якое вы ўзначальваеце?

— Перспектывы ў нашага прадпрыемства ёсць, і мы над гэтым працуем. Аднак цяпер, калі шчыра, завод знаходзіцца ў няпростай сітуацыі. ЗШВ традыцыйна вырабляе віскозную тэкстыльную нітку, і тут ёсць вялікая канкурэнцыя з боку кітайскіх вытворцаў. А ўвогуле наш завод застаўся адзіным прадпрыемствам на постсавецкай прасторы, дзе вырабляецца віскозная тэкстыльная нітка. Усе астатнія проста зачынены, а еўрапейскія фірмы пераносяць свае вытворчасці ў Кітай, дзе танная працоўная сіла і меншыя патрабаванні ў энергетыцы.

— Ці можа сёння магілёўская прадукцыя на роўных канкураваць з кітайскай?

— Безумоўна, так, што датычыцца тэхнічнага боку. А вось па цэнах — на жаль, складаней. Мы возім сыравіну з Котласа і Байкала: транспарціроўка цэлюлозы каштуе нямала. Тут нам без падтрымкі канцэрна «Белнафтахім» не абысціся.

Мы таксама вырабляем дзвюхаснаарыентаваную поліпрапіленавую плёнку. У 1998 годзе была ўведзена ў эксплуатацыю ўстаноўка «Bruckner», якая і цяпер адзіная ў Беларусі. Аднак Расія ў гэтым кірунку рухаецца вельмі хутка. Сыравіна для гэтай вытворчасці імпартная і дарагая. І зноў: калі па якасці мы можам канкураваць, то па цане балансуем на мяжы.

— Аднак стаяць на месцы і проста чакаць надыходу лепшых часоў завод, канешне, не збіраецца...

— Стаяць на месцы нельга. Таму мы пайшлі на паглыбленую перапрацоўку плёнкі. Гэта друк на ёй, металізацыя — ведаеце, напэўна, што ў металізаваную плёнку запакоўваюць кветкі, ламінаванне — гэта павялічвае бар'ерныя ўласцівасці плёнкі. Плёнка харчовая, мае адпаведны сертыфікат. Арэхі, семачкі, макарону, пельмені і іншыя папулярныя харчовыя тавары запакоўваюць у нашу плёнку. Адзін Ваўкавыскі мясакамбінат выкарыстоўвае каля двух дзесяткаў відаў асартыменту, што вырабляецца на нашым прадпрыемстве.

— Што яшчэ робіцца для мадэрнізацыі прадпрыемства, пераходу на больш сучасны ўзровень?

— Распрацавана і ўзгоднена з канцэрнам інвестыцыйная праграма. Сёлета запланавана некалькі мерапрыемстваў, каб выйсці на больш стабільную працу па вытворчасці віскознай тэкстыльнай ніткі. Яны дазволяць знізіць сабекошт прадукцыі і атрымаць прыбыткі.

У вытворчасці поліпрапіленавай плёнкі таксама запускаецца новая ўстаноўка, якая дазволіць пускаць у справу і адыходы плёнкі. Раней іх проста збіралі і збывалі, а цяпер мы зможам зрабіць другасную сыравіну і з яе вырабіць паўнавартасную прадукцыю. Якраз цяпер прыехаў нямецкі спецыяліст, які правядзе тэставыя выпрабаванні па вырабу плёнкі з эфектамі стрэтч (якая расцягваецца) і твіст (якая скручваецца). Якраз твіст-плёнку можна выкарыстоўваць для ўпакоўкі цукерак. Мы пашыраем асартымент выпускаемай прадукцыі і імкнёмся заняць новыя нішы на рынку.

У межах той жа інвестыцыйнай праграмы ёсць планы набыць станок па вырабу флексаформаў — клішэ для друку на плёнцы. Пакуль мы вымушаны замаўляць іх у свайго канкурэнта, аднак ужо ўлетку нам абяцаюць прывезці новую ўстаноўку. І мы атрымаем поўны вытворчы цыкл.

— Дзе сёння набываюць прадукцыю ЗШВ?

— Віскозную нітку набываюць у асноўным краіны Сярэдняй Азіі і, у меншай ступені, Еўропы. Гэта традыцыйны тэкстыльны рынак. У справе продажу плёнкі нам вельмі дапамагае прадстаўніцтва канцэрна ў Расіі «Белнафтахім-РОС». Мы імкнёмся выкарыстоўваць тавараправодную сетку канцэрна і маем намер выйсці на рэалізацыю металізаванай плёнкі ў Расіі. Эксперыментальныя партыі ўжо адпраўлены. Плёнку з малюнкамі і ламінаваную мы прадаём на ўнутраным беларускім рынку.

— Што робіцца на заводзе штучнага валакна для паляпшэння экалагічнай абстаноўкі?

— Пры сённяшнім узроўні вытворчасці віскознай ніткі колькасць выкідаў не ўплывае на агульную экалагічную сітуацыю ў Магілёве, што і пацвярджаецца інфармацыяй Гідрамета. Летась мы набылі станцыю маніторынгу навакольнага асяроддзя.

Цяпер вядзецца мадэрнізацыя трубы-вежы. Раней там была драўляная абшыўка, а пасля рамонту будзе шклопластык, які будзе служыць 20 гадоў.

Трэба адзначыць, што віскозная тэкстыльная нітка вырабляецца цэнтрыфугальным метадам. У нас стаяць машыны 1954 года выпуску. На жаль, нічога больш новага ў гэтым накірунку не прыдумалі больш чым за паўстагоддзя. Але ў свеце ёсць і іншыя спосабы вырабу гэтай ніткі, і там ужо працуюць машыны іншага класа, якія дазваляюць засяродзіць выкіды ў рабочай зоне і адправіць іх цэнтралізавана на перапрацоўку. Набыццё такога прынцыпова новага абсталявання запланавана на 2009—2010 гады. І калі планы спраўдзяцца, то гэта палепшыць не толькі экалагічную абстаноўку, але і ўмовы працы нашых людзей.

— Скажыце некалькі слоў пра калектыў ЗШВ.

— На заводзе сёння працуе болей за 2200 чалавек. Тут ёсць цэлыя дынастыі, і некаторыя работнікі гавораць з гонарам, што маюць агульны сямейны стаж на прадпрыемстве 150 гадоў!

Гавораць, што хімік — гэта асаблівы лёс і менталітэт. Гэта праўда. Па-першае, што хімічная галіна небяспечная і працаваць тут няпроста. Па-другое, хімічны працэс ідзе ў адпаведнасці з часам, і калі ты разгубіўся і страціў час, то гэта — брак, урон прадпрыемству і людзям. Таму меней слоў — больш справы! Такая і пазіцыя ўсяго канцэрна «Белнафтахім»: прыйшлі, вырашылі, зрабілі.

— Цяпер да кіравання ЗШВ прыйшлі маладыя людзі. Як гэта адбіваецца на працы прадпрыемства?

— Так, галоўны інжынер Пётр Акулевіч, мой намеснік па камерцыі Аляксандр Камароў і намеснік па эканоміцы Дзяніс Напрэеў таксама маладыя людзі. Яны прыўносяць у працу свае новыя, свежыя ідэі і энергічна іх ажыццяўляюць. Мы ніякай Амерыкі не адкрылі, а проста нармальна працуем і дзякуючы падтрымцы канцэрна можам рабіць нешта новае. «Белнафтахім» дапамагае грашыма і вопытам. У межах канцэрна праходзяць семінары і дырэктарскія справаздачы. Да нас калегі з канцэрна абяцаюць прыехаць на справаздачу сёлета.

Увогуле, амаладжэнне кадраў — агульная тэндэнцыя канцэрна. Мы ўваходзім у склад вялікай сям'і «Белнафтахім», якая ўтварае больш за трэць беларускага бюджэту, і дзякуючы канцэрну сталі мяняцца нашы прадпрыемствы. Значная частка інвестыцыйнай праграмы нашага завода фінансуецца з фонду канцэрна. І гэта дазваляе нам праводзіць мадэрнізацыю і абнаўленне вытворчых ліній.

Я, дарэчы, толькі што вярнуўся з Масквы, дзе паспяхова быў заключаны кантракт на мадэрнізацыю лініі па выпуску плёнкі. Гэта будуць рабіць немцы, бо менавіта яны выпусцілі гэтую лінію. Устаноўка па флексадруку італьянская, устаноўка па металізацыі і іншыя — англійскай вытворчасці. У нас — еўрапейскія партнёры.

Тэхніка па вытворчасці віскознай тэкстыльнай ніткі ў нас расійская, а пра мадэрнізацыю мы размаўлялі з японцамі, італьянцамі, немцамі, швейцарцамі. Перамовы працягваюцца.

— Якія ж складовыя поспеху вы сёння бачыце, калі зазірнуць у перспектыву магілёўскага прадпрыемства?

— Безумоўна, людзі, якія тут працуюць. Якія б ні былі тэхніка і тэхналогія, але чалавек кіруе імі. Другое — гэта падтрымка канцэрна «Белнафтахім», таму што гэта дае нам супольны вопыт дырэктараў і новыя магчымасці. І, канешне, новыя тэхналогіі, якія дзякуючы першым двум складовым, будуць укаранёны на заводзе штучнага валакна.



Галоўны тэхнолаг Нэлі САВЕЛЬЕВА паказвае прадукцыю завода і сертыфікат якасці.

МАДЭРНІЗАЦЫЯ ДЗЕЛЯ РАЗВІЦЦЯ

Пётр Акулевіч — галоўны інжынер завода штучнага валакна. Ён магіляўчанін, і ў мясцовым тэхналагічным інстытуце атрымаў адукацыю інжынера-хіміка-тэхнолага. Акулевіч называе прафесію «сваёй доляй», бо ў Магілёве некалькі буйных хімічных прадпрыемстваў і гэта вызначыла яго выбар. Пётр Пятровіч 10 гадоў працуе на ЗШВ, дзе прайшоў шлях ад майстра да сённяшняй пасады, на якой працуе каля года.

— Праца адказная, бо адчуваеш, што за табой стаіць вялікі калектыў, — гаворыць галоўны інжынер. — Трэба развіваць прадпрыемства, і гэта залежыць ад усіх працаўнікоў. Як мы ўсе разам будзем працаваць, такія і атрымаем вынікі.

На заводзе прынятая праграма развіцця да 2010 года. У ёй закладзена мадэрнізацыя вытворчасціяў. Пётр Акулевіч лічыць галоўнай задачай ЗШВ захаванне вытворчасці віскознай тэкстыльнай ніткі. Яна сёння запатрабавана спажыўцамі. Віскозная тэкстыльная нітка набліжана да натуральнай, бо яна, хоць і хімічным спосабам атрымана, але вырабляецца з натуральнага матэрыялу — драўніны. Таму насіць вырабы з віскозы рэкамендуецца, яны карыстаюцца папулярнасцю і не выпадаюць з сучаснай плыні, арыентаванай на ўсё экалагічнае і натуральнае.

На заводзе пачалі справу мадэрнізацыі з перагляду выдаткаў на вытворчасць. У першую чаргу гэта датычылася эканоміі энергіі: гэта важна, бо ў структуры сабекошту прадукцыі энергетыка складае 30 працэнтаў. Толькі на гэты год распрацавана больш за 40 мерапрыемстваў па энергазберажэнню. Каэфіцыент энергазберажэння на ЗШВ дасягаў 22.

— Мы ўсталявалі больш сучаснае абсталяванне на вытворчых лініях, — тлумачыць галоўны інжынер. — Імкнёмся знізіць усе выдаткі — і энергетычныя, і працоўныя, і матэрыяльныя, каб зменшыць сабекошт прадукцыі і атрымаць прыбыткі. А таксама павялічым аб'ёмы вытворчасці. Калі летась мы вырабілі 3600 тон віскознай тэкстыльнай ніткі, то сёлета запланавана — 5160 тон. Я лічу, што цалкам рэальна захаваць вытворчасць віскознай тэкстыльнай ніткі: яна будзе працаваць.

Плёначная вытворчасць таксама будзе развівацца далей: упаковачная прадукцыя карыстаецца вялікім попытам. Увогуле, паводле праграмы развіцця, у 2010 годзе завод павінен выйсці на атрыманне прыбыткаў, рэнтабельную вытворчасць і ісці далей. Пакуль жа вялікую падтрымку Магілёўскаму ЗШВ аказвае канцэрн «Белнафтахім».

— Канцэрн — гэта магутная арганізацыя, яна дапамагае заводу ў забеспячэнні сыравінай, ажыццяўленні мадэрнізацыі, — гаворыць Пётр Акулевіч. — У нашым жыцці ён іграе вялікую ролю. З дапамогай канцэрна завод працуе рытмічна, стабільна. Мы правялі вялікую працу па добраўпарадкаванню завода, прыкладаем шмат намаганняў, каб замяніць ручную працу на аўтаматызаваную, дбаем пра экалогію. І я хацеў падзякаваць за гэта кан-цэрну «Белнафтахім» і нашым працаўнікам. А таксама павіншаваць усіх з Днём хіміка.

Галоўны інжынер ЗШВ Пётр АКУЛЕВІЧ.

ІДЭІ І ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ

Галоўны тэхнолаг Нэлі Пятроўна Савельева — адна са старэйшых працаўніц на заводзе. Прафесію хіміка яна абрала як самую модную і прэстыжную. Гэта было ў 1970-х гадах. Пасля заканчэння Усесаюзнага інстытута расіянку Нэлі Савельеву ў ліку іншых лепшых студэнтаў накіравалі на працу ў Магілёў, на новае вялікае прадпрыемства «Хімвалакно». Але ў выніку яна трапіла на пасаду начальніка змены на завод штучнага валакна, і ніколі пра гэта не пашкадавала.

— Гэта была цікавая праца, і я была задаволена ёй, — узгадвае жанчына. — Я бачыла вытворчасць знутры, і гэта важна для любога кіраўніка — не толькі мець добрую адукацыю, але і ведаць чарнавую працу. Праўда, у той час усё было вельмі цэнтралізавана і гэта тармазіла працу хімічных прадпрыемстваў. Цяпер прыйшоў іншы час.

Гістарычна склалася, што амаль у цэнтры Магілёва працуе вялікае хімічнае прадпрыемства, за што завод штучнага валакна шмат папракалі. Ад завода патрабавалі ўкаранення новых тэхналогій і ўвагі да экалогіі. Цяпер усе недахопы гэтай пляцоўкі сярод абласнога цэнтра новае кіраўніцтва імкнецца пераўтварыць у вартасці. Тут ёсць уся інфраструктура, людзям зручна дабірацца да завода, аднак пры гэтым трэба яшчэ і мадэрнізаваць вытворчасць і выканаць усе экалагічныя нормы.

— Ідэя такая: стварыць невялікае па аб'ёму, але эфектыўнае прадпрыемства, — тлумачыць Нэлі Пятроўна. — З аднаго боку, трэба ўкараніць, што і робіцца, сучасныя тэхналогіі самых перадавых фірмаў для выпуску канкурэнтаздольнай прадукцыі, і паэтапна мадэрнізаваць старую вытворчасць віскознай тэкстыльнай ніткі.

Ёсць ужо і вынікі працы ў гэтым накірунку. Напрыклад, выпуск новай прадукцыі. Цяпер да ўсіх прадпрыемстваў прад'яўляюцца вялікія патрабаванні па выпуску новай прадукцыі. Заводу штучнага валакна даведзена заданне: 10 працэнтаў абнаўлення прадукцыі за год.

— Гэта для старога прадпрыемства істотная лічба, — тлумачыць Нэлі Пятроўна. — Для гэтага ж трэба паставіць новае абсталяванне, настроіць яго, вырабіць, асвоіць новыя рынкі... Але мы спраўляемся, і атрымліваем 13—14 працэнтаў. У асноўным абнаўленне датычыцца плёнкі, паглыблення яе перапрацоўкі. Мы наносім на яе друк, ламінуем, металізуем і гэтак далей. Гэта сучасны від упаковачнага матэрыялу, і за кошт новых відаў мы павялічваем рынкі збыту.

Амаль усю прадукцыю завода сертыфікавалі, і кіраўніцтва лічыць гэта надзвычай важнай справай. Таксама мае сертыфікат сістэма кіравання якасцю.

— Мы спрабуем усімі сродкамі — у тым ліку і арганізацыйнымі — вырашаць праблемы абнаўлення завода, — гаворыць галоўны тэхнолаг.

Нэлі Савельева лічыць, што камандзе маладых кіраўнікоў, якая цяпер прыйшла на завод, па сілах ажыццявіць праекты абнаўлення прадпрыемства. І пайсці яшчэ далей: стварыць на пляцоўцы завода дадатковыя вытворчасці. Трэба, паводле меркавання галоўнага тэхнолага, рухацца хутчэй — ад аднаго праекта да наступнага, новага.

— Я б хацела пажадаць маладым, каб у іх было паболей удачы, — гаворыць на правах старэйшага Нэлі Пятроўна. — Канешне, ёсць складанасці ў нашай працы, але калі ў цябе ёсць надзея, упэўненасць у лепшым, якое наперадзе, тады зусім іншы настрой.

КАЛЕКТЫЎ АДНАДУМЦАЎ

Валянціна Уладзіміраўна Шчамялёва, начальнік цэха па вытворчасці і перапрацоўцы полімерных плёнак, трапіла на завод штучнага валакна ў 19 гадоў. Пачала з перамоткі нітак і працавала на самых розных вытворчасцях. Стаўночых вынікаў дамагалася бяссоннымі начамі, адмовай ад святаў і адпачынку. Цяпер Валянціна Уладзіміраўна кіруе калектывам у амаль сотню чалавек: яе падначаленыя — у асноўным маладыя мужчыны да 30 гадоў.

— Перспектыва ў нашага завода ёсць, — упэўнена Шчамялёва. — У нас вельмі працаздольны калектыў. Яго ўзначальваюць маладыя людзі, перспектыўныя. І гэта як Богам дадзена, каб лёс завода быў звязаны з моладдзю. Я ў іх веру, і душой адчуваю, што ўсё ў іх атрымаецца.

На ЗШВ гавораць, што для добрага працаўніка ўзрост не мае значэння, а важны, як кажуць, агонь у вачах. А для маладых адно з самых патрэбных якасцяў — здольнасць вучыцца, не баяцца пытацца і рабіць высновы з парад старэйшых. Вопытныя работнікі лічаць, шо цяпер галоўнае — каб быў калектыў аднадумцаў, якія будуць верыць у перспектыву завода.

— Мы працуем і верым, што ўсё будзе добра, — гаворыць 28-гадовая Юлія Міранкова, якая працуе намеснікам начальніка вытворчага аддзела.

Яна атрымала дзве адукацыі і пачынала на заводзе майстрам змены. Шэсць гадоў працуе і гаворыць, што завод ёй падабаецца.

— Змянілася знешняе аблічча завода — гэта кожны можа ўбачыць, — расказвае пра перамены за апошнія гады Юлія. — І прыйшлі маладыя спецыялісты. Гэта паказчык таго, што ў прадпрыемства ёсць будучыня. У маладых іншае мысленне, сучаснае. І моладзь у нас добра прымаюць. Старэйшыя работнікі не адмаўляюць нам, а вучаць. І, ведаеце, няма ў іх сквапнасці аддаць свае веды і вопыт.

Начальнік аддзела кадраў Святлана Грыдасава расказвае, што летась завод прыняў 24 маладыя спецыялісты, і гэта, на яе погляд, нямала.

— У нашым калектыве ёсць касцяк, які захоўвае традыцыі завода, — расказвае Святлана. — А маладыя — гэта наш патэнцыял, які прыносіць з сабой шмат новага, прагрэсіўнага і дае накірунак — куды рухацца.

Кіраўніка аддзела кадраў, маладая жанчына, прыехала ў Беларусь з Буратыі, спачатку вучылася ў Магілёве, а потым у Мінску авалодала ўсімі тонкасцямі кіравання працоўнымі рэсурсамі прадпрыемства.

— Мы не стаім на месцы: ёсць ратацыя кадраў, — тлумачыць Святлана. — Мы вучым працаваць: калі не хапае ведаў — ёсць магчымасць вучыцца, было б толькі жаданне. Мая вера ў светлую будучыню завода асноўваецца на тым, што тут добрыя людзі працуюць.

— Нам маладыя спецыялісты патрэбны, — пацвярджае дырэктар Алег Буракоў. — Калі ідзе абнаўленне тэхнікі, то 45-гадовым людзям цяжка перастроіцца на працу на ноўтбуку. А малады чалавек ужо навучаны працаваць на такой тэхніцы, знаёмы з новымі праграмамі і тэхналогіямі.

— Пад кіраўніцтвам маладой каманды наша прадпрыемства працуе і дае нядрэнныя паказчыкі, — адзначыў галоўны інжынер Пётр Акулевіч. — Значыць, мы спраўляемся са сваімі задачамі.

Установка па выпуску шматслойных плёнак. На ёй працуе машыніст Аляксей ПРОХАРАЎ.

Перамотчыца цэха віскознай тэкстыльнай ніткі Святлана ШЫМКОВІЧ.

Вытворчасць поліпрапіленавай плёнкі. Аператар Юрый САЛАГУБАЎ.

Віншаванні з Днём хіміка

— Я працую 22 гады на заводзе і мяркую, што перспектывы ў яго добрыя, — гаворыць вядучы інжынер-тэхнолаг Святлана СТАНКЕВІЧ. — Тут вытворчасць пашыраецца, набываецца новае абсталяванне. І калектыў малады і перспектыўны. У наша прафесійнае свята жадаю калегам творчых поспехаў, і каб яны працавалі з аптымізмам, ахвотай.

— Гісторыя нашага завода немалая, але цяпер тут усталёўваюць самае новае абсталяванне і ўкараняюць самыя высокія тэхналогіі, — расказвае механік цэха па вытворчасці і перапрацоўцы поліmерных плёнак Андрэй ЦІМАШЭНКА. — Я думаю, што прадпрыемства будзе развівацца. Я жадаю ўсім добра адзначыць наша прафесійнае свята. І каб ва ўсіх была стабільная праца і заробак.

— Я хачу, каб мае калегі жылі не толькі сённяшнім днём, а верылі, што наш завод штучнага валакна пратрымаўся 77 гадоў і, дай Божа, будзе працаваць як мінімум столькі ж, — сказала сваё слова Юлія МІРАНКОВА. — Жадаю, каб праца хімікаў дастойна аплачвалася, і дабрабыту.

— Я зычу хімікам найперш здароўя, — выказала свае пажаданні Нэлі САВЕЛЬЕВА. — Хімічная вытворчасць, як правіла, складаная, напружаная, і здароўе, і аптымізм тут асабліва дарэчы. І яшчэ я вельмі хачу, каб ажыццявіліся ўсе нашы праекты, і тады хімікі будуць задаволены вынікамі сваёй працы і карысць для ўсёй краіны будзе вялікай.

— Жадаю хімікам упэўненасці ў заўтрашнім дні, — сказаў Пётр АКУЛЕВІЧ. — Каб работнікі, якія прыходзяць на наш завод і іншыя хімічныя прадпрыемствы, былі ўпэўнены, што ў іх ёсць праца, заробак, а, значыць, мы будзем жыць і будзе ў нас перспектыва.

— Хачу павіншаваць з прафесійным святам калектыў Магілёўскага Завода штучнага валакна і сказаць людзям дзякуй за іх працу, — падвёў вынік дырэктар ЗШВ Алег БУРАКОЎ. — Многія з нашых работнікаў адзначаць свята ўдарнай працай, бо хімічная прамысловасць — няспынная. Я таксама хачу павіншаваць кіраўніцтва і работнікаў канцэрна «Белнафтахім», якія шмат дапамагаюць нам. Усіх калег — з традыцыйным святам Днём хіміка!

Матэрыялы паласы падрыхтавалі Ілона ІВАНОВА і Мікалай ЦІТОЎ (фота).